КОДЭКС ГОНАРУ ПРАПАВЕДНІКА: НА ШЛЯХУ ДА СТВАРЭННЯ ПАМЯРКОЎНАЙ ПРАПАВЕДНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

ГІШАМ АТ-ТА́ЛІБ

Кодэкс гонару прапаведніка

На шляху да стварэння памяркоўнай прапаведніцкай дзейнасці

П-р Гішам ат-Та́ліб

Другое выданне,
дапоўненае і выпраўленае

© Гішам ат-Та́ліб, 2021

У імя Аллага Літасцівага, Міласэрнага!

Клянуся часам надвячорку (*або часам, у якім адбываецца багата дзівосных з'яваў і павучанняў*)! Папраўдзе, кожны чалавек церпіць пэўную страту (*з-за сваіх нядобрых задумаў і прыхамацяў*), акрамя тых, якія паверылі, здзяйснялі праведныя справы, наказвалі адзін аднаму трымацца праўды *(у перакананнях, словах і ўчынках*) і наказвалі адзін аднаму цярпенне (*падчас цяжкасцяў, якія чакаюць таго, хто прытрымліваецца рэлігіі*)!

(Сура "аль-Аср", аяты 1-3, дапаўненні
паводле "Тафсіру аль-Мунтахаб")

Асноўная ідэя кнігі

Асноўная ідэя кнігі – гэта заклік усіх мусульман, і ў прыватнасці, прапаведнікаў з іх ліку, каб яны прынялі шэраг прынцыпаў і пазіцый, якія у сваёй сукупнасці стануць зводам правілаў для вядзення практычнага закліку, свайго роду канстытуцыяй ідэйнай і практычнай культуры, павялічваючы долю поспеху, разважнасці і эфектыўнасці, і памяншаючы долю рознагалоссяў, памылак і правалаў.

ЗМЕСТ

Асноўная ідэя кнігі 5
Прадмова да другога выдання 11
Прадмова да першага выдання. 13
Некаторыя праявы абуджэння. 13
Розныя фактары 14
Закон ўзаемнага стрымлівання. 14
Вызваленне і свабода 15
Паражэнне 1967 году. 16
Падзенне Савецкага Саюза 16
Падзеі ў Нью-Ёрку 9/11 17
Важнасць і неабходнасць усведамлення 18
Цяжкасці і перасцярогі 19
Прычыны цяжкасцяў 20
Пачатак рашэння 20
Унутраныя і знешнія пагрозы 21
Неабходнасць напісання дадзенай кнігі 21
Галоўная думка гэтай кнігі 23
Мэта кнігі 23
Каму адрасавана гэта кніга? 23
Плён кнігі 23
Добрыя чаканні 24
На што абапіраецца эта кніга? 24
Асаблівасці кнігі 25

Тэма першая:
Іслам, да якога мы заклікаем
- 26 -

1. Поўнае адзінабожжа 26
2. Рэлігія адзінабожжа і адзінства 28
3. Зварот да асноўных крыніц 29
4. Іслам з'яўляецца ўніверсальнай рэлігіяй 30
5. Універсальнасць – гэта сэнс пакланення 31
6. Ісламскае братэрства 32
7. Моцны вернік. 33
8. Перасцярога ад фальшывай пабожнасці 33
9. Паслушэнства і грахі 34

Другая частка:
Ісламскія пытанні
- 35 -

10. Сям'я у ісламе 35
11. Жанчына у ісламе 35
12. Свабода з пункту гледжання ісламу 37
13. Правы чалавека ў ісламе 37
14. Братэрства людзей у ісламе 38
15. Дзве ўзаемадапаўняльныя прыхільнасці 39

Трэцяя частка:
Асабістая і калектыўная сувязь
паміж прапаведнікамі
- 40 -

16. Узаемадапаўняльныя аспекты вядзення закліку 40
17. Павага да спецыялізацыі 40
18. Выбар найбольш зручных абставін 41
19. Супольная аснова 42
20. Ідэйнае адзінства 42
21. Мусульманская супольнасць 43
22. Паміж афіцыйным і нефармальным 43
23. Дзейнасць фондаў 44
24. Камандны дух 45
25. Нарада 45
26. Размеркаванне адказнасці 46
27. Неабходная асаблівасць 47
28. Павага, але не культ асобы 47
29. Радавацца іншай думцы 48
30. Мы не прэтэндуем на выключную правільнасць 49

Чацвертая частка:
Развіццё і навучанне закліку
- 50 -

31. Вызначэнне мэтаў 50
32. Гледзячы у будучыню 51
33. Мудрае абнаўленне 52
34. Самадастатковасць 53
35. Прыклад для пераймання 53
36. Становішча, да якога нельга імкнуцца 53
37. Аддаваць перавагу самаму годнаму 55

38. Гэтага неабходна прытрымлівацца 55
39. Самаўлюбёнасць і міг расстання. 56
40. Дух пазітыву 57
41. Сфера уплыву і сфера зацікаўленасці 57
42. Межы адказнасці чалавека 58
43. …але з іх саміх будзе спытана 59
44. Важнасць узаемнага кантролю 59

Пятая частка:
Правілы вядзення закліку
- 60 -

45. Правілы калектыўнага пошуку рашэнняў 60
46. Правілы рознагалоссяў 61
47. Як прытрымлівацца мазхаба ў фікху 62
48. Правілы мэтаў шарыята. 64
49. Правілы прыярытэтаў 64
50. Правілы працы з вынікамі 65
51. Правілы працы з рэчаіснасцю 65
52. Правілы памяркоўнасці і справядлівасці 66
53. Правілы карысці і шкоды 67
54. Правілы Боскіх законаў 68
55. Правілы паступовасці 68
56. Правілы паэтапнасці. 69
57. Правілы выбару прапаведнікаў 69
58. Правілы паводзін у часы смуты 70

Шостая частка:
Пытанні, звязаныя з метадалогіяй
- 72 -

59. Іслам і вядзенне закліку 72
60. Найлепшая метадалогія. 72
61. Вядзенне агульнага закліку 73
62. Каранічныя прынцыпы з'яўляюцца непахіснымі пастулатамі 73
63. Пачынаць адтуль, дзе спыніліся іншыя. 73
64. Ясныя лозунгі 74
65. Дакладная тэрміналогія. 74
66. Развіццё ўсведамлення магчымай рызыкі 75
67. Шчырасць і правільнасць 76
68. Натхнёнасць у меру 76
69. Мужнасць рухацца наперад 77

70. Мужнасць адступіць 78
71. Неабходны спакой 78
72. Значэнне мае змест, а не форма 79
73. Нашае грамадства з'яўляецца мусульманскім, але.... 79
74. Новыя вернікі 80
75. Перамогі і паразы 81
76. Стаўленне да хадзісаў, у якіх сказана пра смуту і бітвы 81
77. Будучыня – за ісламам 82

Сёмая частка:
Мэты і сродкі
- 84 -

78. Мэты і сродкі 84
79. Надаваць увагу выдатным асобам 84
80. Этыкет вядзення дыялогу 85
81. Калі варта заняцца менш важнымі справамі 85
82. Неабходная радасць 85
83. Не напаказ 86
84. Важнасць вывучэння арабскай мовы 87
85. Сродак і мэта 87

Восьмая частка:
Перасцярогі у пытанні метадалогіі
- 89 -

86. Пакліканне, а не рамяство. 89
87. Адзінае кіраўніцтва 89
88. Падманныя змяненні 90
89. Адказная рэакцыя 90
90. Ментальная спешчанасць 91
91. Фанатызм і прыхільнасць 92
92. Веліч, але ўсё ж... 92
93. Традыцыі – не рэлігія 93
94. Адступленне, заняпад і млявасць 93
95. Марнаванне часу 95
96. Крайняя марнасць 95
97. Небяспека ўтойвання 96
98. Небяспека абагульнення 96
99. Таемныя змовы 97
100. Карысныя супярэчнасці 98
Завяршэнне 99

Прадмова да другога выдання

Звярнуўшы ўвагу на кнігу “Кодэкс гонару прапаведніка”, праз пэўны прамежак часу пасля яе першага выдання, можна пераканацца, што яна была напісана са шчырым намерам і цвярозым розумам. Імкненне палепшыць існуючае становішча і пільная ўвага да розных павучальных прыкладаў дапамаглі зрабіць высновы з падзеяў мінулых гадоў. Усе вышэйзгаданае пацвердзіла, што гэтая кніга з’яўляецца мудрай і годнай працаю, мэтай якой з’яўляецца дасягненне задаволенасці Аллага і аказанне дапамогі ўсёй мусульманскай супольнасці, далёкай ад вузкасці рэлігійнай разрозненасці, празмернай прыхільнасці да тых ці іншых партый і рэгіёнаў. У дадзенай працы сутнасць пераважае над выкладаннем, мэта – над сродкам, а змест – над формай. Гэтую кнігу можна назваць практычным дапаможнікам кожнага, хто хоча прыдбаць з яе карысць і пераканацца ў яе перавагах. Пры гэтым любы можа звярнуць увагу аўтара на недахопы і памылкі, якія змяшчаюцца ў гэтай кнізе, і прыняць непасрэдны ўдзел у яе паляпшэнні.

Улічваючы гэтыя спрыяльныя фактары, было падрыхтавана другое выданне, якое змяшчае важныя правілы і выпраўленне некаторых выказванняў. Усё гэта было зроблена для таго, каб кніга стала больш дакладнай, заслужыла добразычлівасць чытача; каб яна стала больш аб’ёмнай ў адных пытаннях і менш аб’ёмнай ў іншых. Такім чынам, другое выданне стала лепш, чым першае. І мы вельмі спадзяемся, што трэцяе выданне будзе нашмат лепш, чым два папярэднія.

Кніга “Кодэкс гонару прапаведніка” заслужыла вельмі шмат пахвальных водгукаў. Дастаткова той паваж-

най і каштоўнай рэцэнзіі, якую напісаў на яе праведны настаўнік Саліх аль-Хусэйін (хай злітуецца з яго Аллаг). Аўтар таго водгуку быў вельмі дальнабачным чалавекам, уладальнікам грунтоўных ведаў у сферы шарыяцкага права і тонкім правазнаўцам. І гэта ўжо не кажучы пра дасціпнасць яго розуму, рэдкую шчырасць і выключны аскетызм. У дадатак да ўсяго сказанага, Саліх аль-Хусэйін быў вельмі добра абазнаны пра асаблівасці і памылкі вядзення ісламскага закліку. Ён ніколі не хваліў навакольных незаслужана: як у малых, так і ў вялікіх пытаннях. Хай надзеліць яго Аллаг шчодраю ласкаю і дасць мусульманам найлепшае ад яго.

Я не прэтэндую на тое, што дадзенае даследаванне ідэальнае або бясхібнае, бо гэта асаблівасць з'яўляецца выключнай рысай пасланцаў і прарокаў. А калі нехта ўявіў, што уласным разуменнем цалкам ахапіў нейкую навуку, той ужо паказаў сваё невуцтва, таму што веды – гэта бязмежны акіян!

Уся хвала належыць Аллагу. Я сведчу, што няма нікога, вартага пакланення, акрамя Цябе, о Аллаг! Я прашу ў цябе прабачэння і каюся перад Табой.

Мір і дабраславенне нашаму Прароку Мухаммаду, яго сям'і і яго паплечнікам.

Хішам ат-Таліб
2019 г./1440 г.х.

Прадмова да першага выдання

Мусульманскі свет ахапіла ўсебаковае абуджэнне. Дадзены факт з'яўляецца станоўчай і дабраславёнай з'явай, якая паказвае на вяртанне ісламскай супольнасці да прытомнасці, вылячэнне ад бестурботнасці, перажыванне за сябе, услаўленне ёю сваёй рэлігіі, імкненне пераадолець сваю адсталасць і вызваленне ад усялякай ментальнай і побытавай залежнасці.

Па волі Усявышняга Аллага, гэта абуджэнне дасягнула немусульманскіх краін, у якіх мусульманская меншасць пражывае удалечыні ад ведаў і учынкаў адпаведна ім. Гэтыя супольнасці заслугоўваюць пахвалы за тое, што цяпер яны задумваюцца аб супольнай працы ў сферы закліку. Разам з тым яны стараюцца абапірацца на праверэныя крыніцы ў ісламскім праве і ў сферы адміністрацыйнай працы. Усе згаданыя дасягненні мусульманскай меншасці пацвярджаюць тое, што яно ўжо выйшла з узроўню звычайнага вучня, які навучаецца ў школе, і са стану жабрака, які просіць міласціну. Але, нягледзячы на ўсе вартасці прадстаўнікоў мусульманскіх меншасцяў, нягледзячы на абмежаваныя магчымасці і прыкладзеныя каласальныя намаганні, іх усё ж недастаткова.

Некаторыя праявы абуджэння

Выдатныя праявы можна ўбачыць у розных сферах жыцця: у ісламскім цэнтры, у мячэці, у інвестыцыйнай кампаніі, у фінансавай структуры, у дабрачынных праектах, у выданні часопісаў і газет, у перакладах і напісанні кніг, якія распаўсюджваюцца для давядзення закліку.

Няма аніякага сумневу, усе вышэйзгаданыя праявы фактычна існуюць і заслугоўваюць аказання падтрымкі і звароту з малітвай да Аллага за іх.

Розныя фактары

Гэтае абуджэнне з'яўляецца пладом шматлікіх чыннікаў і вынікам калектыўных і індывідуальных намаганняў. Але перш за ўсё гэта вынік натуральнага прыроджанага жадання, якое паказвае на імкненне мусульманскай супольнасці вярнуцца да сваёй сутнасці і вытокаў, і бліскучы доказ таго, што гэтая рэлігія аберагаецца і апякаецца Аллагам.

Той, хто вывучае гэтыя з'явы і меўся б напісаць іх гісторыю, не змог бы назваць дакладную дату іх пачатку. Таму што ў іх глыбокія карані, часамі відавочныя, а часам і схаваныя.

Затым варта адзначыць, што вядзенне закліку няспынна: яно было, ёсць і будзе. Проста немажліва, каб заклік спыніўся. Бясспрэчна, часам ён слабее, а часам – узмацняецца; часам пакутуе на хваробы, а часам – робіцца здаровым, але пастаянства закліку – гэта адзін з Боскіх законаў. А, як вядома, законы Усявышняга ніколі не знікнуць і не зменяцца.

Закон ўзаемнага стрымлівання

Усявышні Аллаг ў Кур'ане сказаў:

﴿ وَلَوْلَا دَفْعُ اللَّهِ النَّاسَ بَعْضَهُم بِبَعْضٍ لَّفَسَدَتِ الْأَرْضُ وَلَٰكِنَّ اللَّهَ ذُو فَضْلٍ عَلَى الْعَالَمِينَ ﴾

"Калі б Аллаг не стрымліваў адных людзей іншымі, зямля прыйшла б у раздрай. Але Аллаг – Апякун над сусветамі" (Сура "аль-Бакара», аят 251).

Аллаг усталяваў Свае сусветныя законы і зрабіў іх абавязковымі. Гэта з'яўляецца адной з найпрыгажэйшых праяваў ласкі і справядлівасці Аллага. Да такіх законаў таксама адносіцца і "закон узаемнага стрымлівання". Усе людзі роўныя перад гэтымі законамі, незалежна ад рэлігійнай або расавай прыналежнасці.

Адной з адметных рысаў гэтага закона з'яўляецца тое, што ён дае надзею прападнікам і дае ім пэўныя магчымасці, засцерагаючы іх жыццё ад застою і бяздзейнасці. Таксама гэты закон нагадвае кожнаму мусульманіну пра тое, што Сапраўдным Валадаром усяго быцця з'яўляецца толькі Аллаг. Гэты факт павялічвае упэўненасць і спакой верніка, а таксама спадзяванне на Бога падчас працы і ўмацоўвае яго сэрца.

Якая ж вялікая мудрасць Усявышняга Аллага, у адпаведнасці з якой скрозь тоўшчу зла можа прабівацца дабро, а праз дабро можа пранікнуць зло! Уся сіла, якая існуе на зямлі, знаходзіцца ў пастаянным руху. Адна яе частка дзейнічае, а другая – процідзейнічае. Скрозь прызму гэтага руху з'яўляецца шанец як у дабрадзеяў, так і ў злачынцаў; як у мусульман, так і ў немусульман здзяйсняць добрае або чыніць дрэннае.

Вызваленне і свабода

Колькі бед вытрымаў ісламскі свет ад рук каланізатараў! Але яшчэ больш небяспечным відам каланізацыі з'яўляецца культурнае зняволенне. Бо ваенная акупацыя захоплівае землі і людзі бачаць яе ўвачавідкі. А культурная акупацыя захоплівае розумы: людзі не бачаць яе і бесклапотна ставяцца да яе. Такім чынам, сёння мусульманская супольнасць больш за ўсё мае патрэбу ў вялікім вызваленні. Таксама зазначым, што культурная каланізацыя заўжды выкарыстоўвае ўсе новыя і новыя шляхі і сродкі. Справядліва адзначыць, што мусульма-

не прыклалі нямала намаганняў для ліквідацыі гэтага віду каланіялізму, але іх усё яшчэ недастаткова і ім варта працягваць, пакуль яны не вызваляцца ад культурнай акупацыі ва ўсіх яе праявах.

Паражэнне 1967 году

Тым не менш, у 1967 годзе адбыўся паваротны момант у сучаснай гісторыі. Паражэнне арабаў з боку Ізраіля тады стало псіхалагічным, інтэлектуальным, палітычным, сацыяльным і ваенным узрушэннем для іх, і гэта ўзрушэнне – сярод іншага – прывяло да крыўды людзей на лідараў, вінаватых у паразе, і на прынцыпы, якімі кіраваліся гэтыя лідары: сярод іх – сацыялізм, лібералізм, нацыяналізм і баасізм. Таму людзі адрынулі іх і пачалі шукаць альтэрнатыву. І тут яны звярнуліся да ісламу. Гэта і нядзіўна: яны – мусульмане ад першага да апошняга, таму і групы, і асобныя людзі, звяртаюцца да Бога у часы нягодаў і бяды.

Таму можна сказаць, што параза 1967 года надала ісламскай супольнасці штуршок, і, такім чынам, яна стала важнай вехай у яе гісторыі.

Падзенне Савецкага Саюза

Абуджэнне няспынна ішло па ўсім свеце. І хоць час ад часу, то там, то сям, з'яўлялася пэўная доля памылкі, але гэтая доля ні ў якім разе не адмяніла таго правільнага, што несла гэта абуджэнне. Так доўжылася да таго часу, пакуль вялізарнае узрушэнне не падштурхнула да кроку наперад – гаворка ідзе пра падзенне і распад Савецкага Саюза ў 1991 г. Сталася так, што гэткая вялікая дзяржава была разбурана рукамі яе ж сыноў. На руінах адной вялізарнай краіны утварыўся цэлы шэраг незалежны дзяржаў. Разам з Савецкім Саюзам крах пацяр-

пеў і камунізм, які грунтаваўся на атэізме (бязбожжы). Менавіта Савецкі Саюз ваяваў з усімі рэлігіямі ўвогуле і з ісламам у прыватнасці, таму існаванне гэтай імперыі прыносіла няшчасце рэлігіі і вернікам. Яе падзенне дало мусульманам выдатны шанец весці заклік на прасторах зніклай дзяржавы, далучаючы да яго новыя тэрыторыі.

Крах Савецкага Саюза таксама з'яўляецца адным з вынікаў "закона ўзаемнага стрымлівання". І ўся ўлада належыць Аллагу як у мінулым, так і ў будучыні!

Падзеі ў Нью-Ёрку 9/11

Праз дзесяць гадоў адбылося чарговае ўзрушэнне – у 2001 годзе былі разбураны гандлёвыя вежы-двайняты ў Нью-Ёрку. Людзі пачалі па-рознаму тлумачыць, што адбылося тады. Магчыма, дадзеная падзея нават застанецца адной з загадак гісторыі. Але, няма сумневу, гэта ўзрушэннне стала прычынай акупацыі Афганістана і Ірака Злучанымі Штатамі Амерыкі. Таксама яно паслужыла пачаткам для цэлага шэрагу інфармацыйных, палітычных, эканамічных, культурных і ваенных кампаній супраць ісламу і мусульман, якія ахапілі ўвесь свет у цэлым і ЗША з Еўропай у прыватнасці. Абсалютная большасць аналітыкаў разглядаюць дадзеную падзею негатыўна або некампетэнтна. І толькі абсалютная меншасць выказваецца справядліва.

Гэта ўзрушэнне, нягледзячы на яго трагічныя акалічнасці, прыцягнула ўвагу многіх людзей да ісламу, стаўшы магчымасцю пазнаёміць людзей з гэтай рэлігіяй. Дадзены факт таксама з'яўляецца адным са станоўчых вынікаў "закона ўзаемнага стрымлівання". І ўся ўлада належыць Аллагу як у мінулым, так і ў будучыні!

***

Наколькі вялікая Мудрасць Усявышняга Аллага, па Волі Якога ўсе мінулыя і будучыя падзеі закліканы падрыхтаваць урадлівую глебу для ўспрыняцця чыстай рэлігіі Божай, каб вывесці ўсё чалавецтва з аблуды да правільнага шляху, з нядолі да шчасця.

Важнасць і неабходнасць усведамлення

Як там ні было, мусульманская супольнасць павінна мець на ўвазе наступнае:

- магчымасць пазнаёміць людзей з ісламам надзвычай рэдкая. Яна знікне, калі прапаведнікі не нададуць належнай увагі супрацы ў дадзеным кірунку;
- заканамернасці, якія Аллаг зладзіў у гэтым жыцці, не дазволяць ісламскай супольнасці дасягнуць поспеху проста так, проста за тое, што яна фармальна вызнае іслам;
- варта заахвочваць разумных і здольных прадстаўнікоў ісламскай супольнасці звярнуць увагу на магчымыя памылкі закліку, і заняцца іх выпраўленнем перш, чым яны здарацца, перасцерагаючы ад іх іншых. Варта выправіць гэта становішча з мінімальнымі стратамі;
- варта імкнуцца да новых гарызонтаў, выкарыстоўваць новыя сродкі і інструменты данясення закліку, каб пазбегчы яго замарожвання, аслаблення і інертнасці;
- лепшым прадстаўнікам ісламскай супольнасці варта размячаць шлях руху, задаваць яму правільны кірунак;
- яны павінны стараццa пашыраць прастору згоды паміж калегамі і зменшыць долю існуючых паміж імі рознагалоссяў.

Цяжкасці і перасцярогі

У працэсе абуджэння людзі празмерна ўзрадаваліся, самазаспакоіліся і заняліся будоўляй ружовых мараў.

Але каб уявіць сабе поўную карціну, трэба адзначыць, што і станоўчыя з'явы непазбежна суправаджаюцца пэўнымі цяжкасцямі, якія перашкаджаюць далейшаму руху.

- Вы можаце ўбачыць, як адны людзі выказваюць нязгоду з іншымі, а часам нават варагуюць і плятуць інтрыгі, у выніку чаго ўзнікаюць і множацца канфлікты, варажнеча і раз'яднанасць. Некаторыя нават заўважаюць, што паміж сабой рознагалосяць усе мусульмане ў цэлым, і ўсе дзеячы сферы рэлігіі – у прыватнасці. Горкая праўда і невылечная хвароба, ад якой з ласкі Госпада выбавіліся толькі нешматлікія!
- У дадатак да ўсяго, некаторым шчырым высілкам не хапае разважнасці. У выніку выдаткі на вядзенне працы перавышаюць неабходны ўзровень, так што на патрэбнае сродкі не вылучаюцца нават пры іх наяўнасці, затое ахвяруецца на тое, што нанясе шкоду і ўрон;
- Больш за тое, асаблівасцю многіх людзей, якія працуюць на ніве закліку, з'яўляюцца наіўнасць і дабрыня, якія могуць дайсці да ступені нядбайнасці. Гэта, у сваю чаргу, могуць выкарыстаць некаторыя нядобрасумленныя людзі, абводзячы іх вакол пальца. І гэта, несумніўна, шкодзіць краіне, дзе вядзецца заклік, і прапаведнікам. Часам даходзіць да таго, што ў людзей замест прыцягнення да ісламу прышчапляецца зусім адваротнае – непрыязнасць і боязь. Ці не самая важная сфера, у якой прапаведнікі выяўляюць невуцтва – гэта палітыка.

Прапаведнікі прыклалі велізарныя намаганні і ахвяравалі многім у мінулым, а сёння яны самі сталі заснавальнікамі такога становішча, заплаціўшы занадта вялікі кошт.

Прычыны цяжкасцяў

Няма сумневу, што карані гэтых з'яў нельга звесці да адной прычыны. Неабходна звярнуцца да сукупнасці розных узаемазвязаных абставінаў, сярод якіх ёсць як прамыя, так і ўскосныя. Да іх ліку адносяцца наіўнасць, нядбайнасць, паспешлівасць, непадрыхтаванасць, лёгкасць нанясення шкоды і патраплення ў цяжкае становішча, няведанне законаў Аллага, нездаровыя амбіцыі і прыхамаці, якія падштурхоўваюць людзей да дасягнення выгод, панавання і пасадаў. Да такіх прычын таксама можна аднесці і звязаныя з чалавечымі магчымасцямі – разуменне і кемлівасць; а таксама тыя, якія звязаны з асаблівасцямі этапу, які праходзіць мусульманская супольнасць – мноства цяжкасцяў і нечаканых вынікаў могуць адбіцца на ўсіх сферах, а асабліва – на сферы ісламскага закліку.

На тле абставін, якія склаліся, мы абавязаны даць ацэнку гэтай небяспечнай з'яве і сцвердзіць, што рашэння гэтай праблемы немагчыма дасягнуць нейкім адным шляхам, і варта выкарыстаць шэраг узаемадапаўняльных і узаемазвязаных рашэнняў.

Пачатак рашэння

Верагодна, рашэнне гэтай праблемы з'яўляецца першачарговай задачай сярод астатніх. Карэктаванне агульных правілаў, якімі кіруюцца прапаведнікі ў сферы ісламскага закліку, павінна быць прадметам асаблівай увагі. Бо правілы, у значнай ступені, уплываюць

на агульныя ўяўленні чалавека і на яго мысленне, а таксама адбіваюцца на матывацыі да дзеянняў і на практычным складніку.

Агульнавядома, што памылковае ўяўленне нейкага пытання вядзе да памылковага шляху, а правільнае ўяўленне – да правільнага шляху.

З самага пачатку варта адзначыць, што ніхто не кажа, што адна толькі карэкцыя тых ці іншых правілаў зможа вырашыць праблему. Але можна сказаць, што такое дзеянне істотна палегчыць існуючае становішча.

Мусульманская супольнасць мае вострую патрэбу ва ўмацаванні, падтрымцы, настаўленні і пераглядзе тых ці іншых пытанняў з улікам наяўнасці ў чалавечых учынках як правільнасці, так і памылковасці.

Унутраныя і знешнія пагрозы

Адраджэнню часам пагражае штосьці як звонку, так і ўнутры. Унутраная пагроза была і застаецца нашмат больш небяспечнай, чым знешняя. Калі знешняя пагроза зыходзіць ад размаітых ісламафобаў, то ўнутраная – ад саміх прадстаўнікоў нашай супольнасці. Прычынай гэтаму можа служыць няправільнае разуменне, скажонае мысленне, душэўная хвароба, недарэчная паспешлівасць, завышаныя патрабаванні і г.д.

Неабходнасць напісання дадзенай кнігі

Цяпер хацелася б сказаць пра важнасць напісання кнігі "Кодэкс гонару прапаведніка", якая прапануецца ўвазе дзеячаў сферы ісламскага закліку. Гэтая кніга змяшчае ў сабе звод асноўных правіл, зразумелых кожнаму. Таксама чырвонай лініяй у кнізе праходзіць разуменне, што людзям варта прымаць існуючыя паміж імі адрозненні, бо мы не можам быць дакладнай копіяй

адзін аднаго. Калі назваць гэта адным сказам: “Разнастайнасць у рамках агульнай справы дапушчальная”, або “Рознагалоссе разнастайнасці – не рознагалоссе нязгоды”.

Зыходзячы з вышэйсказанага і адчуваючы адказнасць за ўзятыя на сябе абавязкі, імкнучыся рэалізаваць абавязак навучання, умацавання і абнаўлення, мы рады прадставіць вашай увазе звод асноўных правіл, якія, на нашу думку, з’яўляюцца вельмі важнымі і карыснымі. Гэтыя правілы здольныя дапамагчы ісламскай супольнасці зрабіць крок наперад, каб яна здолела, з дазволу Аллага, дасягнуць чаканага выніка.

Мы вельмі спадзяемся, што дадзеная кніга асветліць і пакажа прамы шлях прапаведнікам, якія акажуць ёй свой давер і захочуць развівацца ў сферы годнасці і праўдзівасці. Менавіта таму дадзеная кніга атрымала назву “Кодэкс гонару прапаведніка”.

Таксама мы спадзяемся, што прапаведнікі нададуць асаблівую ўвагу чытанню і вывучэнню дадзенай кнігі дзеля таго, каб прыбаць карысць ад правільнага і не пакінуўшы без увагі яе памылкі. Мы б хацелі пачуць ад вас прапановы новых правілаў, каб кожнае новае выданне было лепш, чым папярэдняе.

О наш Госпад, акажы падтрымку нас у тым, чым Ты задаволены, зрабі нас шляхам дасягнення дабра, надзялі нас шчырым намерам, непарыўна звязаным з правільнымі ўчынкамі. Толькі Табе належыць уся хвала ва ўсім! Мір і дабраславенне Аллага нашаму пану Мухамаду, яго сям’і і яго паплечнікам.

Гішам ат-Таліб,
2009 г./1430 г.х.

Галоўная думка гэтай кнігі

Варта адзначыць, што правілы, пералічаныя ў гэтай кнізе, з'яўляюцца вынікам прыкладзеных высілкаў, роздумаў, перагляду, чытання і вельмі ўважлівага і пастаяннага назірання з мэтай вызначыць, што з'яўляецца памылковым, а што – правільным для вядзення ісламскага закліку. Гэтыя правілы ўяўляюць сабой фармулёўкі з ёмкім сэнсам дзеля іх большай перканаўчасці.

Мэта кнігі

Мэта гэтай кнігі – вызначыць пэўныя правілы, з якімі былі б згодныя ўсе прапаведнікі, прыняўшы іх і аддаўшы ім належную павагу. Сцісла кажучы пра мэты кнігі – гэта наданне арыенціраў работы па ісламскім закліку, яднанне прапаведнікаў і ўнясенне новых прапаноў.

Каму адрасавана гэта кніга?

Гэтая кніга адрасавана ўсім, але ў першую чаргу, натуральна, яна адрасавана прапаведнікам, якія змогуць прыдбаць карысць ад яе, а таксама паўдзельнічаць у яе выпраўленні і дапаўненні.

Плён кнігі

Да плёну гэтай кнігі адносіцца многае, і сярод інашага – наступнае:

- Пашырэнне духу любові і даверу сярод прапаведнікаў, наладжванне сувязі паміж афіцыйнымі і неформальнымі коламі прапаведніцкай дзейнасці.
- Памяншэнне рознагалоссяў і долі памылак, і наадварот, пашырэнне згоды і долі правільных учынкаў.
- Заахвочванне да канструктыўнага дыялогу і да пашырэння гарызонтаў поглядаў і мыслення, наданне ўвагі ініцыятыўнасці і абнаўленню.
- Узаемадзеянне ў пытаннях, па якіх ёсць згода, і змякчэнне адзін да аднаго пры наяўнасці рознагалоссяў.
- Пераход ад бяздзейнасці да эфектыўнасці.

Добрыя чаканні

Дадзеная кніга будзе імкнуцца быць:

- практычным узорам, заснаваным на Кур'ане і Сунне;
- далёкай ад крайнасцяў патурання і празмернасці, увасабляючы ў сабе прынцыпы памяркоўнасці і справядлівасці;
- недатычнай да нейкай пэўнай партыі, плыні, групоўкі, прапаведніцкай школы або зямляцтва;
- тэарэтычным, практычным, маральным і выхаваўчым кодэксам для прапаведнікаў;
- якасным, а не колькасным дадаткам да розных практычных пытанняў.

На што абапіраецца эта кніга?

Кніга абапіраецца на такія прынцыпы, як:

- **Іслам**, які з'яўляецца адзіным шляхам для дасягнення шчасця як у сегасветным, так і ў вечным жыцці.

- **Мусульманская супольнасць**, да прадстаўнікоў якой яна і адрасавана.
- **Практычнае вядзенне ісламскага закліку**, які з'яўляецца самай годнай справай на свеце – справай прарокаў і пасланцаў.
- **Радзіма**, якая з'яўляецца калыскай рэлігіі, арабскай мовы, ісламскай спадчыны, пакланення ў мінулым, сучаснасці і ў будучыні.
- **Выхаванне маладога пакалення прапаведнікаў**, каб яно менш памылялася і рушыла шляхам правільнасці.

Асаблівасці кнігі

Гэтая кніга будзе дакладнай, тэматычнай, сумленнай, нейтральнай, яснай, вытрыманай ў навукова-літаратурным стылі, каб чытач змог насамрэч адчуць дух дабрачыннасці і шчырага жадання прынесці карысць справе ісламскага закліку.

Тэма першая:

Іслам, да якога мы заклікаем

1. Поўнае адзінабожжа

Усявышні Аллаг сказаў у Кур'ане:

﴿ قُلْ إِنَّنِي هَدَانِي رَبِّي إِلَى صِرَاطٍ مُسْتَقِيمٍ دِينًا قِيَمًا مِّلَّةَ إِبْرَاهِيمَ
حَنِيفًا وَمَا كَانَ مِنَ الْمُشْرِكِينَ * قُلْ إِنَّ صَلَاتِي وَنُسُكِي وَمَحْيَايَ
وَمَمَاتِي لِلَّهِ رَبِّ الْعَالَمِينَ *
لَا شَرِيكَ لَهُ وَبِذَلِكَ أُمِرْتُ وَأَنَا أَوَّلُ الْمُسْلِمِينَ ﴾

"Скажы: "Папраўдзе, Госпад мой павёў мяне прамым шляхам веры праўдзівай, веравызнаннем Ібрагіма-ханіфа *(прыхільніка адзінабожжа)*. А ён не быў з ліку паганцаў". Скажы: "Папраўдзе, мая малітва і пакланенне маё, жыццё маё і смерць мая – усе прысвечаны Аллагу, Госпаду сусветаў. Няма роўнага Яму. Гэта загадана мне, і я – першы з адданых Яму" *(Сура "аль-Ан'ам", аяты 161-163)*.

Мы верым у Аллага і ў тое, што толькі Ён з'яўляецца Стваральнікам і Правіцелем сусвету;

Толькі Ён па праве заслугоўвае пакланення;

Толькі Яму ўласцівыя атрыбуты дасканаласці і беззаганнасці, і ў Яго няма аніякіх недахопаў.

Мы любім Аллага, прысвячаем толькі Яму сваё пакланенне, узвялічваем Яго, баімся і спадзяемся толькі на Яго.

Мы заклікаем усіх мусульман, а асабліва прапаведнікаў, надаць належную ўвагу пытанню веравучэння

(акыды). Іх разуменне, вера і справы павінны адпавядаць яму. Вера – абсалютна прыярытэтная, самая першая і найвялікшая аснова для ўсіх астатніх рэлігійных палажэнняў, ад іх вытокаў да адгалінаванняў. Вера – тая аснова, якая непарыўна суправаджае ўсе астатнія пытанні ў жыцці мусульманіна.

Акыда гэта не проста раздзел кнігі, якую мусульманіну можна проста прачытаць і забыцца, перайшоўшы да новага раздзелу, а самая важная частка жыцця, якую ён пастаянна павінен трымаць у памяці, вывучаючы наступныя раздзелы.

Акыда – гэта разумовы, духоўны і практычны стан, які суправаджае мусульманіна ўсё яго жыццё, рэгулюючы яго, аж да самай смерці. Натуральна, гэтая важнасць правільных перакананняў абавязвае мусульманіна глыбока і ўсебакова вывучаць неабходныя пытанні, якія выцякаюць з веры. Самым важным з іх з'яўляецца адзінабожжа, пакланенне толькі Аллагу і практычнае ажыццяўленне Яго законаў. Таксама вернік павінен ведаць, што можа так ці інакш парушыць яго веру і вывесці яго з рэлігіі цалкам ці часткова. Варта здзіўлення, што дзеці мусульман ва ўсім свеце ведаюць тое, што парушае рытуальную чысціню, але могуць не ведаць тое, што парушае веру. Вядома, важна ведаць абодва пытанні, але якая вялікая розніца паміж імі!

З іншага боку, варта перасцерагчы ад таго, каб пытанні адзінабожжа рабіліся прадметам выключна механічнага бяздумнага завучвання, што, у сваю чаргу, можа стварыць у носьбіта такіх ведаў ілюзію, што толькі ён знаходзіцца на шляху ісціны. Сярод прыхільнікаў такога падыхода можа распаўсюдзіцца дух самападману і фанабэрыстасці, а ў адносінах да іншых – жорсткасць і пагарда.

Вядома, верыць у правільнасць уласных перакананняў пахвальна і неабходна, але, нароўні з тым, такая

ўпэўненасць павінна непарыўна суправаджацца дабразычылівасцю ў адносінах да іншых. Толькі так можна стаць паспяховым прапаведнікам, які будзе радаваць людзей, а не аддаляць іх ад ісламу; будзе міласэрным, а не чэрствым, у чыім жыцці адзінабожжа будзе ўвасабляцца найлепшым чынам праз розум, сумленне і лад жыцця.

Некаторыя навукоўцы назвалі сем ўмоваў для правільнасці сведчання адзінабожжа ("Няма боства, вартага пакланення, акрамя Аллага"):

1) веданне, якое выключае невуцтва;
2) перакананасць, якая выключае сумнеў;
3) шчырасць, якая выключае надаванне Богу раўні;
4) праўдзівасць, якая выключае крывадушша;
5) прыняцце, якое выключае адмову;
6) паслушэнства, якое выключае пакіданне;
7) любоў, якая выключае нянавісць.

2. Рэлігія адзінабожжа і адзінства

Іслам – гэта рэлігія адзінабожжа і адзінства. Уся мусульманская супольнасць прысвячае пакланенне свайму Госпаду, менавіта таму пры вядзенні закліку варта таксама заклікаць і да адзінства мусульман – адзінства іх думак, пачуццяў і ўчынкаў. Варта перасцерагаць ад раз'яднанасці, бо ў адзінстве сіла, міласэрнасць, дабраславенне і плённасць. Аллаг больш дапамагае аб'яднаным людзям, чым раз'яднаным.

Часам шматлікія высілкі і ахвяраванні на шляху ісламскага закліку, нават наяўнасці значных капіталаўкладанняў і рэальнага клопату аб ім, не прыносяць жаданых і дастатковых вынікаў з-за цэлага шэрагу прычын, да адной з якіх адносіцца раз'яднанасць, якая даходзіць часам да нянавісці і варажнечы. Дапамагчы ў дасягнен-

ні ці прынамсі набліжэнні да жаданага адзінства можа ачышчэнне ўласнага намера – каб ён быў прысвечаны выключна Аллагу; распаўсюджванне любові; пакіданне марных спрэчак адносна другасных пытанняў веравучэння і ісламскага права, у якіх разышліся ў меркаваннях раннія навукоўцы і вакол якіх спрачаліся познія, бо той з іх, хто вынес правільнае рашэнне, заслужыў узнагароду, а хто памыліўся – заслужыў апраўданне.

3. Зварот да асноўных крыніц

Аллаг ў Кур'ане сказаў:

﴿ وَإِذَا جَاءَهُمْ أَمْرٌ مِّنَ الْأَمْنِ أَوِ الْخَوْفِ أَذَاعُوا بِهِ وَلَوْ رَدُّوهُ إِلَى الرَّسُولِ وَإِلَىٰ أُولِي الْأَمْرِ مِنْهُمْ لَعَلِمَهُ الَّذِينَ يَسْتَنبِطُونَهُ مِنْهُمْ وَلَوْلَا فَضْلُ اللَّهِ عَلَيْكُمْ وَرَحْمَتُهُ لَاتَّبَعْتُمُ الشَّيْطَانَ إِلَّا قَلِيلًا ﴾

"Калі да іх [крывадушнікаў] прыходзіць пытанне, звязанае з [грамадскай] бяспекай або страхам, яны распаўсюджваюць яго [сярод людзей]; калі б толькі яны [спярша] перадалі яго Пасланцу і тому, хто валодае ўладай з іх [дасведчаным людзям], *(каб яны высветлілі яго праўдзівасць і затым прынялі рашэнне агучваць ці ж змаўчаць пра гэта)*, то яно стала б вядома тым, хто мог бы вывучыць яго глыбей *(зрабіць з яго правільныя высновы)*. Каб не дабрыня Аллага і ласка Яго, то ўсе вы рушылі б за шайтанам, акрамя хіба нямногіх з вас" *(Сура "ан-Ніса", аят 83)*.

Мы жадаем дабра ўсім людзям і на нас ўскладзены абавязак давядзення да іх закліку. Менавіта таму мы павінны заклікаць людзей звяртацца да першакрыніц ісламу з адкрытым сэрцам і аб'ектыўным розумам. Мы перакананы, што ў гэтых крыніцах людзі знойдуць адказы на ўсе свае пытанні, вырашэнне ўсіх сваіх цяж-

касцяў, прыдбаўшы прамое кіраўніцтва пасля аблуды, ісціну пасля няпраўды, бяспеку пасля страху, спакой пасля трывогі, дабрабыт пасля выпрабавання...

4. Іслам з'яўляецца ўніверсальнай рэлігіяй

Аллаг ў Кур'ане сказаў:

﴿ إِنَّ الدِّينَ عِندَ اللَّهِ الْإِسْلَامُ ﴾

"Папраўдзе, рэлігіяй у Аллага з'яўляецца іслам" (Сура "Алі Імран", аят 19).

Таксама Аллаг сказаў:

﴿وَمَن يَبْتَغِ غَيْرَ الْإِسْلَامِ دِينًا فَلَن يُقْبَلَ مِنْهُ وَهُوَ فِي الْآخِرَةِ مِنَ الْخَاسِرِينَ ﴾

"Хто намагаецца знайсці іншую рэлігію замест ісламу, ад таго не будзе прынята, а ў вечнасці будзе ён сярод тых, хто страціў усё (збанкрутаваў)" (Сура "Алі Імран", аят 85).

Мы верым у тое, што іслам з'яўляецца вечнай, захаванай, праўдзівай і завяршальнай рэлігіяй Аллага. Іслам увасабляе ў сабе нашу тоеснасць, рашэнне ўсіх пытанняў, наша мінулае, будучыню і сучаснасць. Ён з'яўляецца шляхам дасягнення шчасця як у гэтым, так і ў вечным жыцці. Іслам з'яўляецца ладам жыцця, які абраў для нас Сам Аллаг. Мы верым у яго правільнасць, ганарымся ім, шчыруем дзеля яго і гатовыя за яго ахвяраваць усім, што нам дорага.

Іслам з'яўляецца завяршальнай рэлігіяй Аллага для ўсяго чалавецтва. Менавіта таму іслам – універсальная рэлігія, якая парадкуе ўсе сферы жыцця чалавека на асабістым, грамадскім і дзяржаўным узроўні. Іслам –

гэта рэлігія, сістэма, закон, пакланенне, эканоміка, маральнасць, ахова здароўя, сямейны, грамадскі і міжнародны кодэкс. Іслам суправаджае чалавека цягам ўсяго жыцця: з моманту яго нараджэння і аж да яго смерці і ўваскрашэння.

Менавіта таму прапаведнікам варта засяродзіцца на прынцыпе ўніверсальнасці ісламу. Яны павінны спыняць любыя спробы абмежаваць іслам выключна духоўнай сферай пакланення. Прапаведнікам нельга паглыбляцца ў другасныя і прыватныя пытанні, забываючы аб першасных асновах.

5. Універсальнасць – гэта сэнс пакланення

Галоўнай мэтай існавання любога чалавека з'яўляецца пакланенне Усявышняму Аллагу, пра якое Ён сказаў:

﴿ وَمَا خَلَقْتُ الْجِنّ وَالْإِنسَ إِلّا لِيَعْبُدُونِ ﴾

"Я стварыў джынаў[1] і людзей толькі для таго, каб яны пакланяліся Мне" (Сура "аз-Зарыят", аят 56).

Гэта ўніверсальнае разуменне тэрміна "пакланенне" дазваляе чалавеку лепш падпарадкоўвацца Аллагу і больш радавацца непарыўнай сувязі з Ім. На жаль, многія разумеюць сэнс пакланення вузка, зводзячы яго толькі да актаў рытуальнага пакланення. Варта згадаць пра тое, што агульнавядомы ў ісламскай спадчыне тэрміналагічны падзел ісламу на вераперакананне *(акыда)*, рытуальнае пакланенне *('ібадат)* і грамадскія ўзаемаадносіны *(му'амалят)* з'явіўся з-за практычнай неабходнасці пры выкладанні і навучанні, не больш і не менш за гэта. Але такі падзел прывёў некаторых мусульман да

[1] Джыны – іншасветныя істоты, якія з'яўляюцца "паралельным чалавецтвам", якія ўяўляюць сабою свет духаў, надзелены правам выбару веры або нявер'я, здольныя на звышнатуральныя для людзей учынкі і г.д.

абмежавання паняцця “пакланенне” выключна пытаннямі рытуальнага пакланення, а гэта з’яўляецца ў карані няправільным. Гэткае разуменне прывяло да распаўсюджвання няслушнага разумення з аднаго боку і да з’яўлення асаблівага акцэнту на актах пакланення на шкоду іншым аспектам ісламу.

У адпаведнасці з вышэйсказаным мы пераканаы, што тэрмін “пакланенне” мае больш шырокі сэнс. Менавіта так яго разумелі праведныя папярэднікі. Мы заклікаем кожнага мусульманіна разумець дадзены тэрмін правільна, каб пакланенне для яго ахоплівала сабой усе сферы ісламу: перакананні веры, палітычную дасведчанасць, акты пакланення, грамадскія ўзаемаадносіны, дабрачыннасць, данясенне Боскага паслання, карыстанне дазволенымі рэчамі, адпачынак, руплівасць у справах, шчырасць сэрца і інш.

6. Ісламскае братэрства

Ісламскае братэрства з’яўляецца адным з асноўных прынцыпаў ісламу, адной з фундаментальных асноў практычных правілаў вядзення закліку. Папулярызацыя і распаўсюджванне гэтага прынцыпу дазваляе спадзявацца на прыдбанне Божага задавальнення ў жыцці вечным і на атрыманне Боскай дапамогі ў жыцці сегасветным. А адсутнасць ісламскага братэрства можа прывесці да гневу Аллага ў жыцці вечным і да ганьбы ў сегасветным жыцці.

Прапаведнікі павінны пацвердзіць гэты вялікі прынцып як у тэорыі, так і на практыцы, перасцерагаючы ад усяго, што можа прывесці да разладу. Пашырэнне братэрства сярод прапаведнікаў вядзе да дабрыні, міласэрнасці, узаемадапамогі і дабравесця збавення.

Адсутнасць жа братэрства вядзе да адваротных вынікаў: неспакою, жорсткасці, эгаізму, нездаровага суперніцтва, што прадвяшчае пастаянныя няўдачы.

7. Моцны вернік

Мы павінны імкнуцца падрыхтаваць моцнага верніка, таму што ён лепш і больш мілы Аллагу, чым слабы. Менавіта пра гэта гаворыцца ў вартым даверу хадзісе. Сіла павінна ўвасабляцца як у правільнасці рэлігійных перакананняў, глыбіні веры, годных паводзінах і шчырасці, дасціпнасці розуму, так і ў фізічнай моцы.

Менавіта таму мы павінны паслядоўна і ўсебакова клапаціцца пра ўласнае цела. Нам варта ўжываць толькі карысную ежу, займацца фізкультурай і падтрымліваць чысціню. Пры гэтым трэба сцерагчыся усяго шкоднага: наркотыкаў, цыгарэтаў, алкаголю і да таго падобнага. У выкананні гэтых прынцыпаў ёсць багата карысці. Дужае цела зможа вынесці цяжар і адказнасць вядзення ісламскага закліку.

8. Перасцярога ад фальшывай пабожнасці

Сапраўдная пабожнасць – гэта ясны розум і здаровае сэрца. Той, каму ўласціва сапраўдная пабожнасць, станоўча вылучаецца сярод людзей і з'яўляецца ўзорам для пераймання.

Заклікаючы да сапраўднай пабожнасці, мы перасцерагаем ад пабожнасці фальшывай, якая зыходзіць ад сапсаванага розуму або хворага сэрца, альбо ад іх абодвух. Прычынай гэткіх праблем з'яўляецца тое, што ў выпадку фальшывай рэлігійнасці чалавек пачынае кіравацца ўласнымі прыхамацямі або выгадай. Людзі пазбягаюць прыхільніка фальшывай пабожнасці і ён робіцца ўзорам усяго агіднага.

Гэткая “пабожнасць” была і ўсё яшчэ з’яўляецца адной з прычын агіды людзей да рэлігіі Аллага. Негатыўныя і шкодныя наступствы гэтай з’явы нашмат горш, чым наступствы грахоў відавочных грэшнікаў, якія ані’не прэтэндуюць на рэлігійнасць.

Да прыкметаў ілжэ-пабожнасці адносіцца клопат адно толькі аб знешнім выглядзе і занядбанне ісцін, якія павінны захоўвацца ўнутры, або наданне ўвагі пажаданым відам пакланення разам з грэбаваннем абавязковымі, або адмова ад справаў, якія маюць усеагульную карысць дзеля асабістай выгады.

Таксама да прыкметаў ілжэ-пабожнасці адносяцца сітуацыі, калі людзі ўскладаюць віну за ўласныя прыхамаці, злоснасць або немач на рэлігію; займаюць становішча, якога не заслугоўваюць; дасягаюць уласных мэтаў шляхам прыніжэння навакольных і робяць іншыя непрыстойныя ўчынкі.

9. Паслушэнства і грахі

І сэрца[2], і цела ў роўнай ступені здольны і на паслушэнства, і на грахі. І справы сэрца папярэднічаюць справам цела, бо цела залежыць ад рашэнняў сэрца, якое з’яўляецца асновай чалавечай асобы. Сэрца альбо падахвочвае чалавека да паслушэнства, альбо падштурхоўвае да граху.

Зберагчы сэрца ад грахоў нашмат складаней, чым цела. Наладзіць сэрца на паслушэнства значна цяжэй, чым цела.

Кожны мусульманін павінен унікаць грахоў і неадступна трымацца паслушэнства, выконваючы абавязковае і сэрцам, і целам. Менавіта такім чынам можна дасягнуць неабходнай раўнавагі паміж знешнім выглядам і ўнутраным светам, паміж шчырасцю намеру і рухам частак цела.

[2] Сэрца тут выступае, як сінонім розуму.

Другая частка:
Ісламскія пытанні

10. Сям'я у ісламе

Усявышні Аллаг ў Кур'ане сказаў:

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا قُوا أَنفُسَكُمْ وَأَهْلِيكُمْ نَارًا وَقُودُهَا النَّاسُ وَالْحِجَارَةُ ﴾

"О вернікі! Засцерагайце сябе і свае сем'і ад Агню, палівам для якога будуць людзі і камяні" (Сура "ат-Тахрым", аят 6).

Жаніцьба мужчыны на жанчыне – адзіны шарыяцкі дазволены шлях для стварэння сям'і. Сям'я з'яўляецца першым і самым важным этапам выхавання. Сям'я – гэта найвялікшая аснова для існавання грамадства і прыродная калыска падрастаючага пакалення. Адказнасць за выхаванне на гэтым этапе кладзецца на абодвух бацькоў: і на бацьку, і на маці. Менавіта таму мы заклікаем да аховы сям'і, падвышэння яе каштоўнасці і падрыхтоўкі ўсіх неабходных сродкаў для гэтага. Мы катэгарычна выступаем супраць шматлікіх спробаў скасаваць каштоўнасць інстытута сям'і ці хоць неяк пахіснуць яго важнасць.

11. Жанчына у ісламе

Мусульманка можа пацярпець у адносінах да сябе несправядлівасць, якая сыходзіць з двух бакоў. Першы бок – гэта радыкальны секулярызм, які імкнецца

сапсаваць мусульманку, аддаліўшы яе ад сваёй рэлігіі, прыроджанай натуры *(фітры)*, цалкам пазбавіўшы яе гонару і годнасці. Другая крайнасць – гэта рэлігійная празмернасць, прыхільнікі якой імкнуцца звязаць жанчыну па руках і нагах, заняволіць яе, пазбавіўшы яе сваёй ролі ў жыцці. Прыхільнікі такога падыходу заслугоўваюць асуджэння, нягледзячы на іх добрыя намеры. Большасць такіх людзей глядзяць на жанчыну скрозь прызму недаверу і грэблівасці. Пры гэтым іх пачуцці змешваюцца з пачуццём апекі.

Крыніцай дадзенага пункту гледжання з'яўляецца няведанне правоў жанчыны ў ісламе, а таксама панаванне пэўных звычаяў і традыцый, якія існуюць вельмі даўно і маюць рэлігійную афарбоўку, хоць іслам да іх не мае аніякіх адносін.

Усе мусульмане, а асабліва прапаведнікі, абавязаны ставіцца да жанчыны з даверам і справядлівасцю. Яны павінны даць ёй магчымасць заняць сваё месца ў жыцці. І да такога стаўлення адносіцца магчымасць займацца заклікам да ісламу. У гэтым ёсць мноства пазітыўных аспектаў, галоўным з якіх з'яўляецца праява справядлівасці. Справядлівасць з'яўляецца важным ісламскім прынцыпам.

Мусульманкі прыносяць багата карысці ісламскаму закліку, асабліва ў тых сферах, дзе роля і магчымасці мужчын абмежаваны. Таксама ў такім стаўленні будзе адказ тым, хто заяўляе пра свае імкненні нібыта "вызваліць жанчыну" ад выдуманай несправядлівасці. Толькі іслам сапраўды справядліва вызваліў жанчыну, захаваўшы яе гонар, правы, самастойнасць, прыроджаную існасць і асаблівасці. Іслам зрабіў жанчыну паловай грамадства, паплечніцай мужчыны і захавальніцай пакаленняў!

12. Свабода з пункту гледжання ісламу

Прапаведнік павінен карыстацца свабодай у межах існуючых законаў. Калі ж казаць пра неабмежаваную свабоду як такую, то яна ёсць вялікім глупствам.

Іслам узвысіў каштоўнасць свабоды, забараніўшы прымус да рэлігіі. Адным з выдатных выказванняў ісламскай спадчыны, якія дайшлі да нашых дзён, з'яўляюцца словы праведнага правіцеля Умара ібн аль-Хатаба (хай будзе задаволены ім Аллаг), які сказаў: "Калі гэта вы паспелі заняволіць людзей, тады як іх маці нарадзілі іх свабоднымі?!"[3]

І менавіта праз прызму дадзенага падыходу можна зрабіць выснову аб дапушчальнай свабодзе пры вядзенні закліку і для іншых пытанняў. Праца ў галіне ісламскага закліку, па-за ўсякім сумневам, будзе мець большы поспех, чым заклік да іншых каштоўнасцей. Бо іслам нясе людзям ісціну і ісламскія каштоўнасці. Заклік да іншых рэлігій або каштоўнасцей не мае такой асаблівасці, таму што прапануе каштоўнасці, якія не прымае прыроджаная натура чалавека.

13. Правы чалавека ў ісламе

Усявышні Аллаг ў Кур'ане сказаў:

﴿ يَا أَيُّهَا النَّاسُ إِنَّا خَلَقْنَاكُم مِّن ذَكَرٍ وَأُنثَى
وَجَعَلْنَاكُمْ شُعُوبًا وَقَبَائِلَ لِتَعَارَفُوا
إِنَّ أَكْرَمَكُمْ عِندَ اللَّهِ أَتْقَاكُمْ إِنَّ اللَّهَ عَلِيمٌ خَبِيرٌ ﴾

"О людзі! Сапраўды, Мы стварылі вас з мужчыны і жанчыны і зрабілі вас народамі і плямёнамі, каб вы спазна-

[3] Гэта было сказана аднаму з намеснікаў, які дапусціў пакаранне невінаватага з-за асабістай крыўды.

валі адно аднаго, і самы шаноўны перад Аллагам сярод вас – найбольш богабаязны. Сапраўды, Аллаг – Дасведчаны, Усёведны" (Сура "аль-Худжурат", аят 13).

Мы перакананыя ў тым, што іслам – прадвеснік першай міжнароднай дэкларацыі правоў чалавека. Іслам з'яўляецца адзінай рэлігіяй, якая спаўна прадстаўляе чалавеку яго правы: свабоду веравызнання і павагу гонару і годнасці, права на атрыманне адукацыі, заключэнне шлюбу, бяспеку, працу, справядлівасць, валоданне уласнасцю і г. д. Іслам высока шануе чалавека і заяўляе пра тое, што апошні з'яўляецца лепшым стварэннем Усявышняга Аллага і Яго намеснікам на зямлі, а ўсё, што існуе, прызначана для служэння інтарэсам чалавека.

14. Братэрства людзей у ісламе

Мы верым у тое, што чалавецтва з'яўляецца адной вялікай сям'ёй, якую яднае братэрства людзей. Стваральнік ўсіх людзей Адзін, бацька – адзін і маці – адна. Людзі былі створаны з зямлі і ў яе вернуцца. Мы заклікаем як мусульман, так і немусульман да ўзаемнага супрацоўніцтва ў пытаннях, якія прыносяць карысць усім людзям. Гэта могуць быць мірныя дамовы, распаўсюд свабоды, усталяванне справядлівасці, барацьба са злачыннасцю, пашырэнне ведаў, абарона дзяцей, дапамога састарэлым, добрасуседства, ахова навакольнага асяроддзя, выкананне заключаных дамоваў.

Самым вялікім доказам, які паказвае на правільнасць дадзенага падыходу, з'яўляюцца словы Пасланца Аллага (мір над ім і дабраславенне Аллага), якія ён вымавіў у сваёй казані на развітальным паломніцтве. Прарок (мір над ім і дабраславенне Аллага) сказаў: "О вернікі! Папраўдзе, Госпад ваш Адзіны, як і айцец ваш адзін.

Усе вы пайшлі ад Адама, а Адам быў створаны з зямлі. Самы лепшы прад Аллагам з вас той, хто самы набожны. Перад Аллагам няма ніякае перавагі ні ў араба над не-арабам, ні ў не-араба над арабам. Перавага ваша – толькі ў богабаязнасці. О Аллаг, засведчы!" *(Муслім)*.

15. Дзве ўзаемадапаўняльныя прыхільнасці

Прапаведнік, дзе б ён не знаходзіўся, павінен турбавацца пра бяспеку сваёй краіны і дабрабыт свайго грамадства, а таксама не пакідаць па-за ўвагай будучы лёс новых пакаленняў. Прыроджаная прыхільнасць чалавека да ўласнай краіны і народу ў ісламе гарманічна спалучаецца са свядома абранай прыхільнасцю да ісламскай рэлігіі. З пункту гледжання ісламу, паміж гэтымі двума відамі прыхільнасці няма ніякай супярэчнасці.

Трэцяя частка:

Асабістая і калектыўная сувязь паміж прапаведнікамі

16. Узаемадапаўняльныя аспекты вядзення закліку

Галоўным прынцыпам супрацоўніцтва паміж ісламскімі арганізацыямі з'яўляецца **ўзаемнае дапаўненне**. Калі гэта, з-за пэўных абставін, немагчыма, то неабходна **ўзаемадапамога**. Калі і гэта немагчыма, то, як мінімум – гэта **ўзаемная павага і мірнае суіснаванне**. Чацвёртым варыянтам можа быць толькі пагібель.

17. Павага да спецыялізацыі

У шарыяцкіх і жыццёвых пытаннях мы павінны звяртацца да ўладальнікаў ведаў, пытаючыся кваліфікаванных, дасведчаных і вартых даверу людзей. Можа так стацца, што нехта з'яўляецца таленавітым, вельмі вядомым прапаведнікам, але, пры гэтым, ён не мае ведаў, дастатковых для вынясення шарыяцкіх рашэнняў (*фетваў*). Можа быць і наадварот, калі вялікі вучоны, здольны адказваць на шарыяцкія пытанні, не прыдатны для адміністрацыйнай працы. Падобнае можна сказаць у адносінах да ўсіх сфер жыцця.

18. Выбар найбольш зручных абставін

Прапаведнікам варта выбіраць месца, час і акалічнасці для найбольш эфектыўнага вядзення закліку. Прапаведнік павінен раіцца ў гэтым пытанні з дасведчанымі, разумнымі і годнымі людзьмі. Бо прапаведнік, свядома ці не, можа выбраць штосьці, зыходзячы з уласных прыхамацяў.

У гэтай сувязі можна прыгадаць, як шаноўны Пасланец Божы (мір над ім і дабраславенне Аллага) ахарактарызаваў некалькіх паплечнікаў у адпаведнасці з характэрнымі ім рысамі.

У зборніку вартых даверу хадзісаў імама Мусліма паведамляецца, што Пасланец Божы (мір над ім і дабраславенне Аллага) сказаў: "Вывучайце Кур'ан у чатырох паплечнікаў – гэта Ібн Умм 'Абд ('Абдуллаг ібн Мас'уд), Му'аз ібн Джабаль, Убай ібн Ка'б і Салім, вольнаадпушчанік Абу Хузэйфы".

Пасланец Божы (мір над ім і дабраславенне Аллага) сказаў пра Халіда ібн аль-Валіда наступнае: "Так, Абдуллаг Халід ібн аль-Валід з'яўляецца адным з мячоў Аллага" *(ат-Цірмізі)*.

Таксама Прарок Мухаммад (мір над ім і дабраславенне Аллага) сказаў: "Самым міласэрным з маёй грамады па стаўленні да маёй грамады з'яўляецца Абу Бакр, самы строгі з іх у рэлігіі Аллага – 'Умар, самы сарамяжлівы – 'Усман, лепшым суддзёй з іх з'яўляецца 'Алі ібн Абу Таліб, лепшым чытальнікам кнігі Аллага з'яўляецца сярод іх Убай ібн Ка'б, лепш за ўсіх забароненае і дазволенае ведае Му'аз ібн Джабаль, лепш за ўсіх пытанні спадчыны ведае Зэйд ібн Сабіт. І сапраўды, у кожнай грамады быў свой давераны чалавек, а давераным чалавекам гэтай грамады з'яўляецца Абу 'Убейда ібн аль-Джарах" *(ат-Цірмізі)*.

З вышэйзгаданых хадзісаў можна зразумець, што ўсе гэтыя паплечнікі былі годнымі людзьмі, але ў кожнага з іх былі свае адметныя рысы і асаблівасці, дзякуючы якім ён вылучаўся ад іншых.

19. Супольная аснова

Немагчыма каб усе прапаведнікі былі цалкам падобныя паміж сабой ва ўсім: у мэтах, у сродках, у перавагах. Паміж імі абавязкова будуць існаваць вялікія ці малыя адрозненні. Але калі чалавек уважліва разгледзіць гэтае пытанне, то ўбачыць, што сярод прапаведнікаў ёсць багата агульнага: у іх перакананнях веры, у пытаннях пакланення, у маральнасці, ва ўзаемаадносінах. Але, на вялікі жаль, існуючыя супярэчнасці з іх згубнымі наступствамі зводзяць на нішто ўсе намаганні. Бо рознагалоссі разбураюць сферу згоды з дзесяціразовай сілай нагэтулькі, што яна здаецца нязначнай, а вобласць рознагалоссяў здаецца непераадольнай.

Менавіта таму можна з упэўненасцю сказаць, што сярод прапаведнікаў павінна быць нейкая агульная аснова, пэўная агульная апора, адносна якой яны будуць адзінагалосныя. І абавязкам кожнага з'яўляецца ведаць гэтую аснову, радавацца яе існаванню, дзейнічаць у яе межах, павольна, але ўпэўнена пашыраючы іх, каб заклік працягваўся і ахопліваў як мага большую колькасць людзей.

20. Ідэйнае адзінства

Адной з прычын раз'яднанасці паміж прапаведнікамі з'яўляецца адсутнасць разумення мінімальна неабходнага адзінства паміж імі. Гэткая праблема раней прыводзіла і ўсё яшчэ прыводзіць да рознагалоссяў у разуменні і мэтах, сродках і прыярытэтах вядзення закліку, а часам – нават да нянавісці і варажнечы.

Менавіта таму мы павінны больш сур'ёзна паставіцца да пытання ідэйнага адзінства паміж прапаведнікамі ў цэлым і звярнуць асаблівую ўвагу на моладзь.

Дасягнуць гэтага можна шляхам распаўсюджвання ісламскай культуры, якая заснавана на Кур'ане і Сунне, духу справядлівасці, узаемадапамогі, спагады, братэрства і аб'ектыўнасці. І тым больш варта ўлічваць глыбокае разуменне прыярытэтаў, валодаць майстэрствам вядзення дыялогу, этыкетам рознагалоссяў, пацвярджаючы ўніверсальнасць ісламa і яго прыдатнасць для любога месца і часу.

Паспрыяць гэтаму можа ўважлівы выбар правільнай літаратуры, якая адпавядае пастаўленай мэце. Выбраныя кнігі варта прапанаваць для чытання прапаведнікам і моладзі, перыядычна дапаўняючы і мяняючы гэты спіс. Менавіта так робяць інстанцыі, адказныя за метадалогію навучання і навучальныя матэрыялы ў міністэрстве адукацыі і выхавання.

21. Мусульманская супольнасць

Мы перакананыя ў тым, што любая група, партыя або рух, які займаецца ісламскім заклікам, з'яўляюцца часткай супольнасці мусульман, але не могуць прадстаўляць усіх мусульман. Гэта значыць, гэтыя групы як могуць быць правыя, так і памыляцца ў справе вядзення закліку і практычнага ўвасаблення ў жыццё тых ці іншых рашэнняў.

22. Паміж афіцыйным і нефармальным

Вядзенне ісламскага закліку з'яўляецца прэрагатывай афіцыйных інстанцый, а нефармальны ісламскі заклік – справа нефармальных рухаў, за якімі не стаяць

дзяржаўныя ўстановы, але якія вартыя ўзяць на сябе гэту місію.

У сілу існуючых акалічнасцяў паміж гэтымі двума формамі вядзення ісламскага закліку час ад часу ўзнікае пэўная напружанасць і непаразуменне. Але для пачатку хацелася б звярнуць увагу на два важныя аспекты.

Першы аспект: не існуе абсалютна правільнай або няправільнай формы вядзення ісламскага закліку. У кожнай з іх ёсць штосьці правільнае і можа быць нешта няправільнае.

Другі аспект: у пэўных сітуацыях афіцыйная форма вядзення закліку можа рабіцца нефармальнай, і наадварот.

Патрабуецца, каб абодва бакі пастаянна прыкладалі мудрыя і шчырыя намаганні для навядзення мастоў даверу, узаемаразумення, супрацоўніцтва і цярпімых адносін. Бо ісламскі заклік з'яўляецца калектыўнай адказнасцю. Калі заклік вядзецца, ад гэтага выйграюць усе. Калі ж заклік спыніцца, то як афіцыйны, так і неафіцыйны бок заканамерна патрапяць у цяжкае становішча.

Дасягнуць ідэала не так проста, але і не немагчыма. З прычыны сваёй велізарнай важнасці рашэнне дадзенага пытання мае патрэбу ў прыкладанні каласальных высілкаў. І мы павінны гэта зрабіць.

23. Дзейнасць фондаў

Мы перакананыя ў эфектыўнасці сістэматызацыі калектыўнай працы ў грамадскіх фондах – у фондах, якія, па-першае, шануюць ісламскую маральнасць, а па-другое, прытрымліваюцца ўласных унутраных статутаў. Мы ўпэўненыя ў тым, што з пункту гледжання канчатковага выніку праца фондаў прынясе нашмат больш карысці мусульманскай супольнасці, чым інды-

відуальная праца, хоць ў любой працы ёсць карысць. Мы перакананыя, што працу фондаў лягчэй кантраляваць, выпраўляць, карэктаваць і паляпшаць. Таксама хацелася б адзначыць, што асобна ўзятыя людзі могуць сысці, пакінуўшы пасля сябе фонды, якія будуць працаваць далей.

24. Камандны дух

Мы клапоцімся пра тое, каб укараніць камандны дух сярод супрацоўнікаў і паглыбіць супольную працу паміж імі. Сярод сродкаў дасягнення дадзенай мэты – павага да кваліфікаваных удзельнікаў і заахвочванне ўмацавання сувязі паміж пакаленнямі. Так мы зможам скарыстацца мудрасцю старэйшага пакалення і актыўнасцю моладзі, аддаўшы перавагу агульнай карысці над асабістай. Таксама мы зможам дамовіцца адносна актуальных шарыяцкіх шляхоў, каб пазбегнуць цяжкасцяў і рознагалоссяў перш, чым яны з'явяцца. Калі ж праблемы ўсё ж-такі з'явіліся, то супольна мы зможам вырашыць іх найлепшым чынам. Мы імкнемся распаўсюдзіць дух сацыяльнай і адміністрацыйнай справядлівасці паміж удзельнікамі закліку.

25. Нарада

Усявышні Аллаг ў Кур'ане сказаў:

﴿ وَأَمْرُهُمْ شُورَىٰ بَيْنَهُمْ ﴾

"[Абяцанае Аллагам з даброт – тым,] хто раіцца паміж сабой пра справы" (Сура "аш-Шура", аят 38)

Таксама Аллаг ў Кур'ане сказаў:

﴿ وَشَاوِرْهُمْ فِي الْأَمْرِ ﴾

“…і райся з імі пра справы” (Сура “Аль Імран”, аят 159)

Абапіраючыся на вышэйзгаданыя аяты, мы заклікаем усіх прапаведнікаў раіцца паміж сабой аб справах закліку. Мы заахвочваем да развагаў, творчасці і павагі іншых пунктаў гледжання, незалежна ад таго, супадаюць яны з нашымі ці не. Мы даем кожнаму права на свабоду думкі і выказванне ўласнага меркавання, пры ўмове, што ўсе згодныя з агульным рашэннем будуць у далейшым прытрымлівацца яго. Вядома, калі такое рашэнне не будзе супярэчыць агульным шарыяцкім прынцыпам.

Для таго, каб калектыўнае рашэнне было правільным ці прынамсі як мага бліжэйшым да ісціны, яго неабходна браць з агульнапрызнаных крыніц. Неабходнай умовай такога падыходу з’яўляецца, каб інфармацыя, на якую абапіраюцца пры вынясенні рашэння адноснага таго ці іншага пытання, была ўсеабдымнай, а намер – шчырым.

26. Размеркаванне адказнасці

Прапаведнікам варта прыйсці да мудрага і яснага механізму ўзаемадзеяння, якога яны будуць прытрымлівацца. Такі механізм забяспечыць размеркаванне адказнасці ў іх арганізацыях, занятых заклікам. Гэта дасць удзельнікам закліку пачуццё задаволенасці, спакою і любові. Гэты крок выключыць магчымасць з’яўлення эгаізму, манаполіі і самаўладдзя. Такім чынам прапаведнікі пазбегнуць раз’яднанасці і смут, пазбегнуць бяссілля і застою ў працы, з’явіцца магчымасць для абнаўлення і творчасці, умацуецца сувязь паміж пакаленнямі. Гэта дапаможа выхаваць большую колькасць

практыкуючых лідараў, умацуе камандны дух і надасць дадатковую павагу вядзенню ісламскага закліку ў фармаце фондаў.

27. Неабходная асаблівасць

Адным з нашых абавязкаў з'яўляецца павага як да ранніх, так і да сучасных прапаведнікаў, вучоных і адраджэнцаў. Мы павінны звяртацца за іх з мальбою да Аллага і пераймаць іх прыклад, але нельга рабіць з іх куміраў, ствараць культ асобы. Так сама мы не маем права бяздумна пераносіць іх заклік на нашу сучасную рэальнасць, ігнаруючы асаблівасці нашага часу і месца. Менавіта таму мы абавязаны шчыраваць таксама, як прыкладалі высілкі яны, і ўлічваць нашы абставіны таксама, як яны ўлічвалі свае.

28. Павага, але не культ асобы

Натуральна, карысна і неабходна мусульманіну любіць свайго кіраўніка, на чале з якім ён вядзе ісламскі заклік; свайго шэйха або імама мячэці, за якім выконвае малітву. Але прыхільнасць і любоў не павінны выходзіць за межы дазволенага. Паслядоўнікі папярэдніх рэлігій патрапілі ў аблуду тады, калі сталі празмерна ўзвялічваць сваіх прарокаў і праведнікаў. Гэта адбылося, калі людзі сталі прыпісваць ім Боскія якасці і атрыбуты. Усё пачыналася з адзінабожжа, а скончылася вялікім шматбожжам.

Адной з хвароб, пашыраных сярод мусульман увогуле і прапаведнікаў у прыватнасці, з'яўляецца залішняе узвялічванне свайго шэйха. Многія з мусульман лічаць, што іх шэйх з'яўляецца непахісным эталонам праўды, з дапамогай якога можна адрозніць правільнае ад памылкі, нібы шэйхі абаронены ад памылак або з'яўля-

юцца бязгрэшнымі. Але пры гэтым яны забываюцца важнае правіла, якое вучыць: "Мы спазнаем людзей па [іх адапаведнасці] ісціне, а не ісціну – па людзях".

Гэтая крайнасць была і застаецца адной з прычын раз'яднанасці сярод мусульман і пашырэння ўзаемнай непрыязнасці паміж прапаведнікамі.

Правільнае вырашэнне гэтага пытання палягае ў тым, каб шанаваць сваіх настаўнікаў у меру, памятаючы пра тое, што і яны з'яўляюцца людзьмі, якія могуць быць правыя, а могуць і памыляцца. Рэлігійныя аўтарытэты вартыя любові, павагі і паслушэнства адпаведна той ісціне, якая ў іх ёсць, з улікам іх поспехаў у распаўсюдзе ісламу і ведаў. Мусульманін заўжды застаецца шукальнікам ісціны, рэлігійны аўтарытэт – адзін са шляхоў [такога пошуку], які рана ці позна знікне, а ідэя з'яўляецца мэтай, якая застанецца назаўжды.

29. Радавацца іншай думцы

Нашы прынцыпы не з'яўляюцца нашай уласнасцю. Наадварот, гэта мы з'яўляемся ўласнасцю нашых прынцыпаў. Таму нам нельга закрываць свае сэрцы перад высілкамі іншых людзей, у якіх, быць можа, іншы спосаб, іншыя намаганні. Наадварот, мы павінны радавацца такім дзеянням навакольных людзей, бо і іх, і нашы высілкі накіраваны на аказанне дапамогі ісламу. Мы павінны любіць і шанаваць іх, даючы ім добрыя парады, дапамагаючы ім, наколькі гэта магчыма. Нам варта абарочваць на агульную карысць любыя высілкі нейкага чалавека ці групы людзей, якімі б яны ні былі, нават калі ім уласціва доля памылкі ці хібы. Мы павінны знаходзіць апраўданне для годных дзячаў, якія ў чымсьці нязгодныя з намі. Паводзіцца такім чынам варта сыходзячы з вядомага выказвання Мухамада Рашыда Рыда':

“Дапамагаць адзін аднаму ў тым, чым мы аднагалосныя, і знаходзіць апраўданне адзін аднаму ў тым, чым мы маем рознагалоссе”.

30. Мы не прэтэндуем на выключную правільнасць

Мы заяўляем і пераканаяы, што не прэтэндуем на абсалютную і выключную правату. Таксама мы перасцерагаем людзей ад таго, каб лічыць уласную пазіцыю адзіна правільнай. Мы пераканаяы ў правільнасці абраных намі мэтаў і сродкаў іх дасягнення, але самі мы не прэтэндуем на ідэальнасць. Мы рады кожнаму, хто пакажа на нашыя памылкі або недахопы. Таксама мы шануем мэты і сродкі, абраныя іншымі людзьмі.

Нам усім варта быць шчырымі перад Аллагам і з усяе сілы імкнуцца да правільнасці. Мы павінны ясна, з усёй сумленнасцю мець мужнасць абнаўляцца і пакідаць памылкі, калі такія выявіліся. Нам варта больш радавацца ад усяго сэрца правільнаму, што робяць навакольныя.

Натуральна, што для гэтага неабходна заклікаць да абмену досведам. Гэта вельмі важна для ўзбагачэння інфармацыйнага запасу прапаведніка і для каманды, разам з якой ён вядзе заклік. Ніколі не было і не будзе такога чалавека, які не мае патрэбы ў добрай парадзе і ў настаўленні. Таксама ніколі не будзе таго, хто мог бы прэтэндаваць на стоадсоткавую правільнасць, тады як іншыя будуць на сто адсоткаў памыляцца.

Чацвертая частка:

Развіццё і навучанне закліку

31. Вызначэнне мэтаў

У кожнай працы на ніве ісламу існуюць пэўныя мэты, якія трэба дасягнуць. Вызначэнне гэтых мэтаў з'яўляецца вельмі важным пытаннем. Менавіта таму прапаведнікі павінны вылучыць належны час для дакладнага і яснага вызначэння мэтаў свайго закліку. Ім варта апісаць свае мэты на паперы, гранічна дакладна выкладаючы кожную з іх, слова за словам, паводле іх важнасці і патрэбы. Калі ж нейкі чалавек або група блытаюць уласныя чаканні з існуючай рэчаіснасцю, то, хутчэй за ўсё, яны будуць асуджаныя на правал і не дасягнуць поспеху. Калі памылка зыходзіць ад асобна ўзятай асобы, то гэта дрэнна, а калі памылка зыходзіць ад групы людзей, то гэта нашмат большая бяда.

Адной з самых вялікіх заўваг ісламскаму закліку, з'яўляецца тое, што большасць яго паслядоўнікаў ведаюць тое, чаго не хочуць, але не ведаюць таго, чаго хочуць. Менавіта з гэтага пачынаецца пастаноўка памылковых або правільных, але невыканальных, мэтаў. Такая мэта шкодзіць, ведучы свайго шукальніка да міража. Пры гэтым добрыя намеры не з'яўляюцца апраўданнем, бо намер – гэта ўсяго толькі палова неабходнага. Другой жа паловай з'яўляецца правільнасць дзеянняў.

Тыя, хто займаюцца вядзеннем ісламскага закліку, павінны дакладна ведаць, хто яны і да чаго імкнуцца. У святле існуючых акалічнасцяў яны павінны абдумва-

ць свае планы і праграмы. Толькі так яны змогуць быць праўдзівымі з самімі сабой і толькі так яны змогуць забяспечыць праўдзівасць у адносінах да сваіх паслядоўнікаў. Зрабіўшы усё вышэйзгаданае, прапаведнікі пойдуць найлепшым шляхам. Калі ж не, то іх можа чакаць фіяска.

32. Гледзячы у будучыню

Па загадзе Аллага, час рухаецца і не спыняецца. Сучаснасць – гэта сын мінулага і бацька будучага. Таму, ведучы ісламскі заклік, варта ўлічваць вопыт мінулага, найлепшым чынам працаваць з сучаснасцю і рыхтавацца да будучыні. Неабходна ствараць неабходныя перадумовы ў межах уласных магчымасцяў, пакінуўшы рашэнне пытання Госпаду сусветаў, верачы і спадзеючыся на Яго.

Шанаваць будучыню і будаваць планы – адзін з абавязкаў прапаведніка. Такі падыход гаворыць пра разважлівасць і з'яўляецца адной з прычын дасягнення поспеху. Калі прапаведнік будзе рабіць вышэйзгаданае, то так будзе правільна, а калі не – то сам сябе асудзіць на застой і замкнёнасць. Планаванне будучыні дазволіць прапаведніку праз некаторы час стаць надзвычай дасведчаным і паспяховым.

Іслам – рэлігія будучыні. Гэта выразна прасочваецца ў шматлікіх пытаннях, найважнейшымі з якіх з'яўляюцца адчуванне таго, што ты заўжды пад наглядам Аллага, а таксама падрыхтоўка да Дня разліку. Бо наша сапраўдная будучыня – там.

Кожны з нас памятае гісторыю прарока Юсуфа (мір над ім), калі ён выратаваў Егіпет ад голаду, мудра спланаваўшы нарыхтоўку ўраджаю ў плодныя гады.

І наш Пасланец Мухамад (мір над ім і дабраславенне Аллага) надаваў асаблівую ўвагу планаванню будучыні,

выкарыстоўваючы для гэтага ўсе магчымыя сродкі. Гэта выразна відаць у планаванні пераезду ў Эфіёпію, перасялення ў Медзіну, у падпісанні пагадненняў з юдэямі, у планаванні ваенных паходаў, якія ён накіроўваў у розныя месцы, у вядзенні баявых дзеянняў, у звароце да кіраўнікоў краін і народаў з заклікам да ісламу, ва ўсебаковым клопаце пра ўнутраныя і міжнародныя справы, у перапісе колькасці мусульман у Медзіне, а таксама ў іншых зробленых ім крокаў, якімі напоўнены яго годны прароцкі жыццяпіс.

33. Мудрае абнаўленне

Мы перакананыя ў важнасці пастаяннага абнаўлення, шануючы пры гэтым непахісныя асновы. Такім чынам можна дасягнуць прынцыпу аб'яднання паміж праведным мінулым і карыснаю будучыняй. Таксама гэта дазволіць наладзіць сувязь паміж сучаснасцю і разуменнем яго асноўных праблем. Гэты падыход дасць нам жыццёвасць, якая засцеражэ нас ад застою, бяссілля і замкнёнасці.

Ісламская праца павінна пастаянна карэктаваць саму сябе. Гэта тычыцца як яе прынцыпаў, так і праграм, лозунгаў і кіраўніцтва. Усё залежыць ад балансу паміж памылкамі і правільнасцю, слабасцю і эфектыўнасцю, магчымым і немагчымым, унутранымі і міжнароднымі зменамі. Вынікам такой карэкцыі стане шэраг рашэнняў: надаць першачарговую ўвагу або адкласці на потым, выправіць або скасаваць, дадаць ці выдаліць, падвысіць ці панізіць. Вядзенне ісламскай працы павінна суправаджацца публічным агалошваннем дапушчаных памылак, каб новыя пакаленні іх не паўтарылі і каб адкрыць новыя гарызонты для прыкладання актыўнасці. Калі ўсё будзе зроблена менавіта так, работа пацвердзіць уласную здольнасць да працягу дзейнасці. І гэта

будзе добры знак. Але калі гэтага не будзе зроблена, то работа можа трапіць ў застой і паглынуць саму сябе. Гэта стане прыкладам найгоршага развіцця падзеяў.

34. Самадастатковасць

Мы заклікаем усіх быць самадастатковымі, абапіраючыся на ўласныя магчымасці, на колькі гэта магчыма. Таму што ахвяраванні не з'яўляюцца сталай і стабільнай крыніцай фінансавання. Можа быць, адным з найбольш эфектыўных крокаў на шляху да асабістай самадастатковасці будзе фарміраванне вакфаў[4], якія б адпавядалі наяўным магчымасцям і варункам жыцця.

35. Прыклад для пераймання

Прынцыпы, праграмы, планаванне і маральнасць супрацоўнікаў любога фонду, які заняты заклікам, павінны быць мудрым і добрым прыкладам для іншых. Калі навакольныя пабачаць усё гэта, то ўразяцца і захочуць пераняць гэты прыклад.

36. Недапушчальнае становішча

Вядзенне ісламскага закліку з'яўляецца самым годным заняткам у жыцці, бо гэтым займаліся прарокі і пасланцы (мір над імі ўсімі і дабраславенне Аллага).

Часцей за ўсё чалавек, якому ўласцівыя нейкія рысы прапаведніка, карыстаецца павагай ад людзей. Яны яго любяць і шануюць. Галоўнае, прапаведнік, які заклікае людзей дзеля Аллага, не павінен імкнуцца да выкарыстання свайго становішча. Наадварот, прапаведнік

[4] Вакф – тут: дабрачынны фонд, прызначаны для падтрымкі пераважна рэлігійных накірункаў дзейнасці (забеспячэнне работы мячэцяў, рэлігійных арганізацый, маламаемных чальцоў мусульманскай супольнасці і г.д.)

абавязаны заклікаць выключна дзеля дасягнення задаволенасці Аллага. І калі пасля ўсяго гэтага, без прыкладання мэтанакіраваных намаганняў, прапаведніку было дадзена такое становішча сярод людзей, то яму варта ўзнесці за гэта хвалу Аллагу і з усіх сіл імкнуцца адпавядаць таму даверу, які яму быў аказаны. У адказ на гэта прапаведніку варта ставіцца да людзей з любоўю і пабожнасцю, быць сціплым, старацца дапамагчы людзям і адмовіцца ад цягі завалодаць іх маёмасцю.

Прапаведнік павінен лічыць аказаны яму давер велізарнай адказнасцю, а не дасягненнем; цяжарам, а не упрыгожаннем; стратай, а не багаццем; цяжкасцю, а не пашанай.

Варта таксама згадаць ў кантэксце сказанага пра тое, што цнатлівасць і сціпласць не азначае, што чалавек павінен цалкам адмовіцца ад займання той ці іншай пасады. Таму што такі падыход відавочна супярэчыць мэтам, якія ўвёў у быццё Мудры і Усёведны Стваральнік. Аллаг зрабіў чалавека Сваім намеснікам на зямлі. Прывядзем прыклад нашага прарока Юсуфа (мір над ім), які займаў высокае становішча і змог з яго дапамогай дапамагчы свайму грамадству, прынёсшы ў яго каштоўны маральны пункт гледжання для вырашэння актуальных пытанняў. Прарок Юсуф (мір над ім) зрабіў свой уклад ва ўмацаванне свайго грамадства, укараненне ў ім каштоўнасці справядлівасці і пабожнасці.

Таму, хто мае асаблівыя якасці і навыкі, дазволена дэманстраваць іх з мэтай прынесці карысць сваёй супольцы, грамадству і чалавецтву ў цэлым. Пры гэтым у таго, каму ўласціва гэта, павінен быць намер зрабіць унёсак шчыра дзеля Аллага. Бо Пасланец Аллага (мір над ім і дабраславенне Аллага) сказаў: “Папраўдзе, справы ацэньваюцца толькі паводле намераў і, папраўдзе, кожнаму чалавеку дастанецца толькі тое, што ён меў намер прыдбаць. Так, той, хто здзейсніў перасяленне да Алла-

га і пасланца Яго, пераселіцца да Аллага і пасланца Яго, а хто перасяліўся дзеля чаго-небудзь сегасветнага альбо дзеля жанчыны, на якой ён меўся ажаніцца, пераселіцца толькі да таго, да чаго ён перасяляўся" *(аль-Бухары)*.

37. Аддаваць перавагу самаму годнаму

Пры выбары кіраўніцтва для вядзення ісламскага закліку варта аддаваць перавагу самым здольным і годным кадрам.

На жаль, вельмі часта многія структуры, якія займаюцца ісламскім заклікам, у той ці іншай ступені не прытрымліваюцца гэтага падыходу. Бывае, хтосьці становіцца кіраўніком толькі з-за свайго красамоўства, хтосьці – з-за сваёй значнасці ў грамадстве, а хтосьці – з-за свайго паходжання.

Але крытэрыямі выбару кіраўніка, як пра гэта сказана ў шарыяцкіх крыніцах, з'яўляюцца не вышэйзгаданыя прычыны, а богабаязнасць, веды і валоданне належнымі якасцямі. Калі абапіраццца на гэтыя крытэрыі, то стане відавочным, хто падыходзіць для той ці інашай пасады, а хто – не.

38. Гэтага неабходна прытрымлівацца

Прынцыпы, метадалогія, планаванне, паводзіны, маральнасць звычайных прапаведнікаў і асабліва кіраўніцтва, у арганізацыях, занятых ісламскім заклікам, павінны быць лепшым прыкладам , які спалучае ў сабе правільнасць, шчырасць і сур'ёзнасць. Прапаведнік павінен уяўляць сабою добры ўзор для пераймання, убачыўшы які, навакольныя будуць паважаць яго і імкнуцца рабіць, як ён. Калі ж прапаведнік страціць мінімальна неабходны ўзровень неабходных якасцяў, то стане больш шкодзіць, чым прыносіць карысць.

Калі пры вядзенні работы па распаўсюдзе ісламскага закліку прапаведнік не будзе прытрымлівацца маральных якасцяў, дзеля данясення якіх ён і працуе, ён стане сапраўдным цяжарам і мінай запаволенага дзеяння, якая рана ці позна выбухне і прывядзе да катастрафічных вынікаў.

Прапаведнік павінен заўжды памятаць пра тое, што добры прыклад для пераймання з'яўляецца найвялікшым, найважнейшым і самы дзейсным способам вядзення ісламскага закліку. Мусульманскія прапаведнікі рознымі шляхамі прыдбалі плён у давядзенні ісламскага закліку, але самым важным спосабам застаецца добры прыклад для пераймання. Менавіта таму вельмі важна, каб прапаведнікі ў першую чаргу сталі сярод людзей узорам для пераймання таго, да чаго яны заклікаюць.

39. Самаўлюбёнасць і міг расстання

У адным з старажытнагрэчаскіх міфаў гаворыцца пра надзвычай прыгожага юнака па імені Нарцыс, які зірнуў на крышталёва чыстую ваду і ўбачыў у ёй сваё адлюстраванне, невымоўна здзівіўшыся сваёй прыгажосці. І ён працягваў углядацца на ўласнае адлюстраванне, пакуль не памёр. У далейшым з гэтай вады вырасла кветка нарцыс. Менавіта ад гэтага пайшоў тэрмін "нарцысізм", пад якім маецца на ўвазе самаўлюбёнасць.

Часам, пры вядзенні ісламскага закліку, выяўляюцца такія ж самаўлюбёныя людзі. Такіх варта пазбаўляць удзелу ў ісламскай працы, нягледзячы на ўсе іх станоўчыя якасці і прафесійныя здольнасці.

"Нарцысы" не ўвасабляюць у сабе абсалютнае зло. Больш за тое, у іх могуць быць пахвальныя якасці. Але такія людзі будуць карысныя ісламскаму закліку роўна да той пары, пакуль не будзе канфлікту паміж заклікам

і іх асабістым інтарэсам. Пачынаючы з гэтага імгнення "нарцысаў" неабходна аддлучыць ад закліку, бо яны могуць нават стаць яго злейшымі ворагамі. Міг расстання рана ці позна надыдзе, таму што такія людзі служаць уласным прыхамацям. Такім чынам, самаўлюбёныя з'яўляюцца бомбай запаволенага дзеяння і ўвядзенне іх у сферу ісламскай дзейнасці з'яўляецца смяртэльнай памылкай, адказнасць за якую нясе чалавек, які дазволіў ім гэта.

40. Дух пазітыву

Мы заклікаем засяродзіцца на станоўчых баках, аптымізме, радаваць сябе і навакольных. А таксама мы заклікаем аддаліцца ад песімізму – ад адштурхоўвання і ўскладнення.

41. Сфера уплыву і сфера зацікаўленасці

У мусульманіна ў жыцці ёсць дзве сферы.

Першая сфера – гэта сфера ўплыву. Пад "сферай уплыву" маецца на ўвазе той дыяпазон магчымасцей, які ўласцівы мусульманіну, каб прынесці карысць самому сабе і навакольным. Напрыклад, да гэтага адносіцца клопат пра уласнае здароўе і зарабляне грошай, аказанне дапамогі сваім сваякам і таварышам, настаўленне на прамы шлях навакольных, развіццё ўласных здольнасцяў, клопат пра сваю сям'ю, вывучэнне законаў, у межах якіх ён павінен жыць у сваёй краіне і г.д.

Другая сфера – гэта сфера зацікаўленасці. Пад ёю маецца на ўвазе той дыяпазон умоваў, у якіх жыве мусульманін на ўнутраным і сусветным узроўні, і на якія асабіста ён ніяк не можа паўплываць. Прыкладам, да гэтага адносіцца рост коштаў на нафту, змены клімату,

забруджванне навакольнага асяроддзя, пашырэнне голаду і г.д.

Разумны мусульманін павінен спалучаць гэтыя дзве сферы, надаючы больш ўвагі першай. Бо ён можа паўплываць на яе непасрэдна і таму што ўскладзеныя на яго Усявышнім абавязкі звязаны з ёю. Што ж тычыцца другой сферы, то мусульманін павінен ставіцца да яе ў адпаведнасці з гранічна выразнымі прынцыпамі і межамі, каб ведаць, што адбываецца ў сучаснасці, і што робіцца з навакольнымі.

А калі чалавек прысвяціць увесь свой час, прыкладаючы ўсе свае намаганні вырашэнню пытанняў, якія яму не пад сілу, то гэта непазбежна прывядзе яго да трывогі, правалу і смутку. Можа стацца, ён нават кіне свае абавязкі, прыдумаўшы для сябе нейкія апраўданні. Наколькі выдатныя словы, якія выказваюць паспяховыя людзі, здольныя знайсці выйсце з любой сітуацыі, і наколькі няўдалыя тыя, хто шукаюць апраўданні і адгаворкі!

42. Межы адказнасці чалавека

Усявышні Аллаг узяў на Сябе абавязак ахоўваць Сваю рэлігію, але разам з тым, Ён, па Сваёй бясконцай мудрасці, усклаў на мусульман адказнасць за клопат аб ісламскай рэлігіі. Гэтая рэлігія, нягледзячы на тое, што яна з'яўляецца відавочнай ісцінай, праходзіць розныя перыяды ў адпаведнасці з прадвызначэннем Аллага. Усе мы ведаем, на якія вялікія ахвяры пайшлі прарокі і пасланнікі (мір ім і дабраславенне Аллага), іх апосталы, паплечнікі і паслядоўнікі для аказання дапамогі і падтрымкі гэтай рэлігіі. Менавіта з такіх людзей трэба браць прыклад і прытрымлівацца іх шляху.

43. “…але з іх саміх будзе спытана”

Сярод многіх прапаведнікаў распаўсюджана меркаванне аб тым, што яны не будуць несці адказнасць за вынікі прыкладзеных імі намаганняў у сферы закліку, калі яны скончацца няўдала. Гэта меркаванне неабходна выправіць, каб праліць святло на сутнасць пытання. Інакш прапаведнікі апынуцца ў велізарнай небяспецы. Самым найменшым наступствам такой небяспекі можа стаць адсутнасць ўзаемнага кантролю, адказнасці і аднолькавае стаўленне да дабрачынцы і ліхадзея.

Калі прапаведнікі будуць:

шчырымі перад Аллагам,

будуць з усяе сілы старацца правільна паводзіцца,

прыкладаючы пры гэтым усе магчымыя высілкі,

то заслужаць удзячнасць за поспех і апраўданне ў выпадку няўдачы. І калі хоць нейкая з трох вышэйпералічаных умоў будзе адсутнічаць, то прапаведнікі абавязкова пацерпяць няўдачу і панясуць адказнасць за вынікі свайго закліку.

44. Важнасць узаемнага кантролю

Узаемны кантроль – гэта адзін з асноўных ісламскіх прынцыпаў і неад’емных метадаў працы. Менавіта таму мы павінны старацца пастаянна яго практыкаваць. Гэтага можна дасягнуць шляхам шчырасці, адкрытасці, самакрытыкі, пастаяннага параўнання і ацэньвання. Гэты шлях дасць магчымасць распазнаць, зберагчы і памножыць станоўчыя перамены. Таксама мы зможам распазнаць, пазбегчы і пазбавіцца негатыўных бакоў. Бо чалавечая праца складаецца як з памылак, так і правільных крокаў.

Пятая частка:

Правілы вядзення закліку

45. Правілы калектыўнага пошуку рашэнняў

Мы глыбока перакананыя і пастаянна сцвярджаем, што іслам – гэта рэлігія, прыдатная для любога часу і месца, і што іслам здольны вырашыць любыя сучасныя праблемы. Для вырашэння гэтых праблем мы звяртаемся да навукоўцаў і прапаведнікаў. Мы вітаем усе формы калектыўнага пошуку рашэнняў[5].

Сярод арганізацый, якія займаюцца такім пошукам рашэнняў – Комплекс па ісламскіх даследаваннях у Егіпце, Комплекс ісламскага права пры Сусветнай ісламскай лізе, Комплекс ісламскага права ў Хартуме, Еўрапейскае таварыства па фетвах і даследаваннях, Таварыства ісламскага права ў ЗША і іншыя інстанцыі. Мы лічым, што стварэнне такіх інстытуцый мае велізарную важнасць і спадзяемся на іх супрацоўніцтва, бо яно толькі павялічыць карысць. Мы таксама спадзяемся, што гэтыя арганізацыі будуць развіваць свае спецыялізацыі, што дазволіць ім заваяваць большы давер і дасягнуць большай эфектыўнасці.

[5] Іджціхад (ар. "стараннасць, прыкладанне максімальных высілкаў") – дасягненне вышэйшай ступені ведаў і набыццё права самастойна вырашаць некаторыя пытанні юрыдычна-багаслоўскага характару.

46. Правілы рознагалоссяў

Іслам узвысіў каштоўнасць адзінства, перасцерагаючы ад раз'яднанасці. Але, пры гэтым, іслам улічвае ўсю разнастайнасць чалавечай прыроды, па прычыне якой рознагалоссяў пазбегнуць немагчыма. Гэта з'яўляецца адным з нязменных законаў Аллага ў Яго стварэннях.

Рознагалоссі падзяляюцца на дзве катэгорыі: карысныя і шкодныя.

Карысныя рознагалоссі – гэта рознагалоссі погляданаў, заснаваная на чалавечым досведзе і непарыўна звязаная з асаблівасцямі чалавечай прыроды. Такім чынам быў створаны чалавек у адпаведнасці з Божаю мудрасцю. Аллаг захацеў стварыць людзей з розным узроўнем мыслення і разумення, падобна таму, як Ён стварыў людзей з розным характарам, колерам скуры, целаскладам і знешнім выглядам.

Шкодныя рознагалоссі – гэта рознагалоссі сэрцаў, пра забароненсць якіх гаворыцца ў святых аятах і хадзісах Прарока. Да такіх аятаў адносяцца словы Аллага ў Кур'ане:

﴿ وَاعْتَصِمُوا بِحَبْلِ اللَّهِ جَمِيعًا وَلَا تَفَرَّقُوا
وَاذْكُرُوا نِعْمَتَ اللَّهِ عَلَيْكُمْ إِذْ كُنتُمْ أَعْدَاءً
فَأَلَّفَ بَيْنَ قُلُوبِكُمْ فَأَصْبَحْتُم بِنِعْمَتِهِ إِخْوَانًا
وَكُنتُمْ عَلَى شَفَا حُفْرَةٍ مِّنَ النَّارِ فَأَنقَذَكُم مِّنْهَا
كَذَلِكَ يُبَيِّنُ اللَّهُ لَكُمْ آيَاتِهِ لَعَلَّكُمْ تَهْتَدُونَ ﴾

"Моцна трымайцеся за повязь Аллага (г.зн. за Кур'ан) усе разам і не падзяляйцеся. Памятайце пра ласку Аллага да вас, калі вы былі ворагамі, а Ён з'яднаў вашыя сэрцы, і з Яго ласкі вы сталі братамі. Стаялі вы на краі вогненнай бездані, а Ён выратаваў вас ад яе. Так Аллаг тлумачыць вам Свае азнакі – каб вы рушылі прамым шляхам" *(Сура "Алю Імран", аят 103).*

Карысныя рознагалоссі ўяўляюць сабой рознагалоссі разнастайнасці *(танавву')*, таксама, як колькасць іскраў павялічвае сілу агню, і, пры гэтым, яны не тушаць адна адну. Шкодныя рознагалоссі ўяўляюць сабой рознагалоссі супрацьстаяння *(тададд)*, якія вядуць да спрэчак і разладу, аслабляючы ўсе бакі спрэчкі. У выніку чаго ўсе ўдзельнікі падаюць духам і губляюць сілы.

Варта адзначыць, што ў ісламе існуе пэўная "забароненая зона", да межаў якой ніхто не мае права падыходзіць. Гэтая "зона" – асноўныя прынцыпы рэлігіі, якія захоўваюць аблічча, дух, пасланне і адзінства мусульманскай супольнасці. Такімі прынцыпамі з'яўляюцца перакананні веры, пакланенне, маральнасць і катэгарычныя законапалажэнні. Прапаведнікам трэба вывучаць правілы і этыкет рознагалоссяў. Яны павінны разумець, што ў навакольных ёсць права на іншую думку, пакуль яно знаходзіцца ў дазволеных шарыятам межах. Да такіх прынцыпаў вядзення дыскусіі адносіцца разыходжанне ў пунктах гледжання па пытаннях, звязаных са спосабамі і метадамі вядзення закліку, адносна якіх дапушчальная разнастайнасць і змена па меры абставін часу і месца.

47. Як прытрымлівацца мазхаба ў фікху

Усе мазхабы[6], а асабліва чатыры агульнавядомыя, з'яўляюцца каштоўнай спадчынай і рэдкім скарбам. Вучоныя дэталёва выверылі мазхабы, а наступныя пакалення надалі ім бляск, сцёршы любыя сумневы ў іх правільнасці. Мазхабы ў фікху[7] з'яўляюцца адным з самых каштоўных скарбаў мусульманскай супольнасці.

---

[6] Мазхаб – багаслоўска-прававая школа. Сунніты павінны прытрымлівацца аднаго з чатырох законных мазхабаў (ханафіцкага, шафііцкага, малікіцкага або ханбаліцкага)

[7] Фікх – ісламскае права.

Мусульманін павінен абраць мазхаб, якога ён будзе прытрымлівацца. Яму, па меры магчымасці, варта вывучаць аргументы гэтага мазхаба, паважаючы пры гэтым выбар іншых мусульман. Калі паміж мусульманамі паўстане дыялог адносна таго ці іншага пытання ў фікху, то яго трэба весці выхавана і па тэме, імкнучыся спазнаць ісціну, незалежна ад каго яна будзе зыходзіць.

Ва ўсіх мазхабах ёсць як больш моцныя, так і больш слабыя бакі. Гэты факт агульнавядомы сярод вялікіх навукоўцаў, якія могуць параўноўваць доказы, аддаваць перавагу найбольш абгрунтаванаму меркаванню і разглядаць актуальныя пытанні.

Вартыя асуджэння слепата і фанатызм асобных прыхільнікаў тых ці іншых мазхабаў могуць нанесці значную шкоду. Але прыніжэнне і барацьба супраць мазхабаў, а таксама заклік простых мусульман да адмовы ад мазхаба і пошуку доказаў наўпрост з Кур'ана і Сунны, нясе ў сабе нашмат большую шкоду. Заклік да знішчэння мазхабаў з'яўляецца недапушчальным. Таксама варта адзначыць тое, што праціўнікі мазхабаў самі ў сваю чаргу ідуць за пэўнымі законапалажэннямі, якія прадыктаваны іх асабістым меркаваннем або іх аўтарытэтамі. Такім чынам, гэтыя людзі, свядома ці не, закладаюць аснову для новага мазхаба, трапляючы ў тое ж становішча, за якое крытыкуюць іншых[8].

[8] Трэба таксама ўлічваць, што чатыры мазхабы суннітаў – гэта школы, якія бяруць выток у прыкладзе і разуменні рэлігіі паплечнікаў Прарока, мір над ім, і іх ранніх паслядоўнікаў. Любая сучасная "супер-абгрунтаваная Кур'анам і Суннай" школа будзе асуджана на бясконцыя памылкі, нязгоду і супярэчанні, паколькі будзе абапірацца на сучасную, а значыць – безнадзейна далёкую ад першаасновы рэканструкцыю разумення першых пакаленняў мусульман.

48. Правілы мэтаў шарыята

Прапаведнікі павінны глыбока разумець правілы мэтаў Шарыяту. Прапаведнікі не павінны прытрымлівацца толькі знешняга сэнсу шарыяцкіх тэкстаў, літаралісцкага падыходу і грэбаваць мэтамі і мудрасцю Шарыяту, якія стаяць за пастановамі Найвышэйшага Заканадаўцы[9]. Гэтым мы не зніжаем каштоўнасць шарыяцкіх тэкстаў і не імкнемся знайсці шлях для ўхілення ад іх выканання. Наадварот, мэта ў тым, каб спасцігнуць дух шарыяцкіх тэкстаў і дасягнуць раўнавагі паміж адназначнымі аргументамі і доказамі, адносна разумення якіх існуюць рознагалоссі. Таксама мэтай такой парады з'яўляецца разуменне другасных пытанняў у святле першасных; у святле агульных мэтаў Шарыяту; у святле правілаў фікха, якія абвяшчаюць: "Змест пагадненняў вызначаецца іх мэтамі і сэнсам, а не [сказанымі падчас іх] словамі і граматычнымі формамі". Іншае правіла фікха таксама абвяшчае: "Учынкі ацэньваюцца паводле іх мэтаў".

Па-за ўсялякім сумневам, што такая пастаноўка пытання абавязвае нас звяртацца да спецыялістаў у гэтай сферы, каб мы маглі прымяніць правілы мэтаў Шарыяту з мудрасцю і правільным разуменнем.

49. Правілы прыярытэтаў

Мы звяртаем увагу на важнасць выканання правілаў прыярытэтаў. Мы заклікаем да выканання гэтых правілаў.

Пытанні ісламу маюць розную ступень важнасці. Напрыклад, пытанне веры і адзінабожжа нашмат больш важнае, чым пытанне выдалення перашкоды з дарогі.

[9] То бок, Аллага.

Таксама і пытанні, звязаныя з вядзеннем ісламскага закліку, маюць розную ступень важнасці. Менавіта таму нам варта глыбока ўсвядоміць пытанне прыярытэтаў і паставіць кожнае пытанне на сваё месца.

Таксама нам варта часам пераглядаць паслядоўнасць прыярытэтаў з улікам змены абставін. Іерархія прыярытэтаў у ісламе непахісна зацверджана, але іерархія прыярытэтаў у вядзенні ісламскага закліку мяняецца ў залежнасці ад часу, месца і чалавека. Відавочна, што логіка прыярытэтаў настойвае, што мы павінны ўмець выбіраць найменш шкоднае рашэнне ў складанай сітуацыі, калі такая з'явіцца. Таксама мы павінны ўмець выбіраць найбольш карыснае рашэнне сярод мноства добрых варыянтаў.

50. Правілы працы з вынікамі

Прапаведнік павінен разумець правілы работы з вынікамі. Пад гэтым азначэннем маецца на ўвазе разуменне магчымых падзей пасля таго ці іншага зробленага кроку. Каб гэта разумець, неабходна быць глыбока дасведчаным аб законах Усявышняга Аллага, а таксама ясна ўсведамляць як мясцовыя, так і міжнародныя абставіны. Менавіта таму прапаведнікі павінны глыбока задумвацца аб выніку таго ці іншага кроку, перш чым рабіць яго. Пры прыняцці рашэння, прапаведніку варта аддаць перавагу перакананасці, а не дапушчэнням; доўгацярпенню, а не паспешлівасці; верагоднасці, а не здагадкам.

51. Правілы працы з рэчаіснасцю

Прапаведнікі абавязаны ведаць правілы працы з рэчаіснасцю. Яны павінны добра разумець варункі і абставіны рэчаіснасці. Прапаведнік павінен усведамляць

сапраўдную розніцу паміж чаканнямі і магчымасцямі. Такім чынам іх лозунгі, мэты і праграмы будуць здзяйсняльныя. Разуменне гэтага пытання вядзе да падрыхтоўкі розуму і загартоўкі характару, да яднання людзей на аптымальнай аснове, да надання ўвагі першасным і неабходным пытанням, а таксама да следавання прынцыпу паслядоўнасці.

52. Правілы памяркоўнасці і справядлівасці

Іслам – гэта рэлігія памяркоўнасці і справядлівасці. Іслам далёкі ад двух крайнасцяў: нядбайнасці і празмернасці.

Усявышні Аллаг ў Кур'ане пахваліў вернікаў, сказаўшы:

﴿ وَكَذَٰلِكَ جَعَلْنَاكُمْ أُمَّةً وَسَطًا لِّتَكُونُوا شُهَدَاءَ عَلَى النَّاسِ وَيَكُونَ الرَّسُولُ عَلَيْكُمْ شَهِيدًا ﴾

"Такім чынам, Мы зрабілі вас супольнасцю, якая прытрымліваецца шляху сярэдзіннасці, каб вы сведчылі пра ўсё чалавецтва, а Пасланец сведчыў пра вас саміх" *(Сура "аль-Бакара", аят 143).*

Гэта азначае, што Аллаг зрабіў мусульманскую супольнасць справядлівай і абранай, бо самымі лепшымі справамі з'яўляюцца памяркоўныя, без крайнасцяў нядбайнасці або празмернасці.

Нядбайнасць вартая ганьбы, бо яна вядзе да разбурэння дабрабыту індывіда і грамадства. А празмернасць асуджаецца, бо яна супярэчыць прыроджанай натуры чалавека, якая не дасць рады яе вынесці. Менавіта таму Аллаг зрабіў іслам памяркоўнай і справядлівай рэлігіяй. Аллаг стварыў чалавека і ўсклаў на яго шары-

яцкія абавязкі, і Ён лепш ведае пра сапраўдную сутнасць, моцныя і слабыя бакі асобы.

Так, мусульманін не паглыбляецца празмерна ў аскетызм, адхіляючыся ад сегасветнага жыцця і забываючы свае сегасветныя абавязкі. Але мусульманіна і не паглынае сегасветнае жыццё – яго не турбуе пастаяннае павелічэнне сваёй маёмасці. Мусульманін падыходзіць да сегасветнага жыцця памяркоўна і справядліва.

Памяркоўнасць ісламу таксама выяўляецца ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, бо ён здольны даць адказы на ўсе пытанні. Іслам з'яўляецца ўніверсальнай і завяршальнай рэлігіяй.

Памяркоўнасць і справядлівасць ісламу выразна бачная ў тым, як ён рэгулюе розныя пытанні: заробак на жыццё, пакланенне, выдаткі, узаемаадносіны, адзенне і г.д. Іслам без нядбайнасці і празмернасці, умерана і справядліва размяркоўвае правы і абавязкі паміж асобай і грамадствам, целам і душой, розумам і сэрцам.

53. Правілы карысці і шкоды

Усявышні Аллаг пажадаў, каб паўстагоддзя таму ісламскі заклік набыў асаблівую сілу і за ім пайшла велізарная колькасць паслядоўнікаў. Такі прагрэс выклікае вялікую радасць, бо гэта рух распаўсюду рэлігіі Аллага, але таксама выклікае і асцярогу з-за вялікай колькасці паслядоўнікаў, якія не маюць належных шарыяцкіх ведаў, выхавання, маральнасці і разумення пытанняў палітыкі. Існуючы стан спраў дае падступным злачынцам магчымасць абвесці наіўных людзей вакол пальца. На жаль, гэта часта бывала раней і адбываецца цяпер. Менавіта таму мудрыя прапаведнікі павінны клапаціцца аб масах простых паслядоўнікаў, выхоўваць і ўмацоўваць іх свядомасць. Гэта павінна быць больш прыярытэтным, чым спроба вывесці заклік на новы ўзровень.

Гэтага варта прытрымлівацца, зыходзячы з вялікага правіла метадалогіі права, якое абвяшчае: “Засцерагчыся ад зла важней, чым прыдбаць карысць”.

54. Правілы Боскіх законаў

Па мудрасці, справядлівасці і міласці Усявышняга Аллага ў адносінах да Яго рабоў, Яго сусветныя законы не ўціскаюць ніводнага чалавека, групу ці рэлігію. Наадварот, усе людзі перад гэтымі законамі роўныя. Шчаслівы заўжды і паўсюль той, хто будзе дыхтоўна і правільна ставіцца да гэтых законаў. Той жа, хто занядбае іх і пераступіць, пацерпіць няўдачу. Сэнс гэтых слоў у тым, што Аллаг не гарантуе перамогу пэўнай асобе або групе з ліку мусульман толькі за тое, што яны вызнаюць іслам – яны мусяць рабіць усё, што ад іх залежыць.

55. Правілы паступовасці

Мы заклікаем да глыбокага разумення такіх тэрмінаў, як паступовасць без паспешлівасці; развіццё без самаўпэўненасці; мудрасць без гарачлівасці; вытрымка без спеху; паслядоўная спакойная дзейнасць, а не хуткая, якая перарываецца. У адным з хадзісаў гаворыцца: “Хто адстае ад спадарожнікаў – той і патрэбнай адлегласці не праедзе, і жывога месца не пакіне на спіне сваёй верхавой жывёлы” *(аль-Баззар, аль-Хакім)*. У другім хадзісе паведамляецца: “Больш за ўсё Аллаг любіць тыя справы, якія робяцца пастаянна, хоць бы іх было і мала” *(аль-Бухары)*. У трэцім хадзісе сказана: “Папраўдзе, рэлігія гэтая лёгкая, але калі хтосьці пачне змагацца з ёй, яна абавязкова пераможа яго” *(аль-Бухары)*. У сувязі з гэтым мы б хацелі згадаць каштоўную мудрасць, якая абвяшчае: “Час лечыць”.

56. Правілы паэтапнасці

Мы пераканаңыя ў неабходнасці паэтапнасці. Пад гэтым маецца на ўвазе размеркаванне задач па меры таго, наколькі яны набліжаюць да галоўнай мэты: так, першае становіцца крыніцай другога і г.д.

Таксама ў паняцце паэтапнасці ўваходзіць фарміраванне мэтаў, якія адпавядаюць надзённым абставінам. Пры вядзенні ісламскага закліку не варта гаварыць пра тое, што прапаведнікі зрабіць не могуць, нягледзячы на магчымую правільнасць апошняга. Часам такое маўчанне нават можа быць абавязковым. Але ні ў першым, ні ў другім выпадку ні ў якім разе нельга казаць тое, што прапаведнікі не жадаюць таго, пра што маўчаць.

57. Правілы выбару прапаведнікаў

Заклік да ісламу з'яўляецца абавязкам ўсіх мусульман, а не толькі студэнтаў шарыяцкіх факультэтаў. Пры гэтым, бясспрэчна, адказнасць студэнтаў нашмат больш. Нам варта нагадваць пра тое, што законы ісламa датычацца ўсіх: баязлівых і смелых, скупых і шчодрых, няўцямлівых і кемлівых і г.д.

Але з прычыны годнасці, важнасці і асаблівай адказнасці пры вядзенні ісламскага закліку, для гэтай дзейнасці варта выбіраць самыя каштоўныя кадры, якім уласцівы годныя чалавечыя якасці, шчодрасць, адвага, цярпенне, рашучасць, бесстароннасць і альтруізм. Нам варта засяродзіцца на тых, хто мае вышэйзгаданыя каштоўныя якасці, вылучаць іх уперад. Такія людзі будуць аздобай у дні дабрабыту і дапамогай у дні цяжкасцяў. Менавіта на такіх людзях будуецца ісламскі заклік.

Гэта не азначае, што яны не памыляюцца ці што ў іх няма недахопаў – усе мы людзі. Але ў сукупнасці іх

якасцяў яны з'яўляюцца каштоўным скарбам. Калі такія людзі і памыляюцца, то ізноў вяртаюцца на шлях правільнасці. Яны аддаюць перавагу агульным інтарэсам над асабістымі, зместу над формай, сутнасці над знешнім выглядам. Яны трымаюцца сваіх прынцыпаў, якой бы вялікай ні была небяспека, аж да самай сустрэчы з Аллагам.

Чым больш будзе такіх каштоўных скарбаў ў ісламскім закліку, тым больш будзе надзеі на поспех.

Пасланец Аллага (мір над ім і дабраславенне Аллага) і ў часы выпрабаванняў не пераставаў звяртацца да Аллага ў Мецці з маленнем аб тым, каб Ён умацаваў іслам адным з двух Умараў. Прарок (мір над ім і дабраславенне Аллага) ведаў, што яны з'яўляюцца каштоўным скарбам. У адказ на просьбу Аллаг даў прыняць іслам геніяльнаму паплечніку, імя якога Умар ібн аль-Хатаб (хай будзе задаволены ім Аллаг). Ён аказаў вялікую дапамогу ісламу.

Таму пры выбары дзеячаў для вядзення ісламскага закліку варта засяродзіцца ў першую чаргу на каштоўных скарбніцах, пры гэтым не адштурхоўваючы і астатніх. Прарок (мір над ім і дабраславенне Аллага) сказаў: "Людзі падобныя да залатых і срэбных руднікоў. Тыя з іх, што былі лепшымі ў часы невуцтва, засталіся лепшымі і ў ісламе, калі засвоілі пастановы рэлігіі" *(Муслім)*.

58. Правілы паводзін у часы смуты

У апошні час, з пэўнай перыядычнасцю перад мусульманамі ўзнікаюць праблемы і складанасці: зневажанне Аллага, прыніжэнне годнасці Пасланца Аллага (мір над ім і дабраславенне Аллага), замахі на мусульманскія дыяспары або на ісламскія святыні, кпіны з непахісных асноваў ісламскай супольнасці і г.д.

Прычыны такіх смут могуць быць рознымі: непрыязнасць, варожасць, невуцтва, цяга да славы, знясільванне самых шчырых з ліку вернікаў і адцягванне ўвагі мусульман ад надзённых праблем.

Разумны прапаведнік павінен аддзяляць такія уплывы падчас узаемадзеяння з людзьмі, улічваючы матывы, магчымыя шляхі рашэння і вынікі, маўкліва сустракаючы гэтыя абставіны, і абгрунтавана абвяргаючы іх падман, выкрываць яго, называючы рэчы сваімі імёнамі. Пры гэтым трэба дакладна планаваць кожны крок, каб не пераступіць межаў дазволенага. Калі ж межы будуць пяройдзены, высілкі прапаведніка будуць змарнаваны і ён патрапіць у пастку марных спрэчак, стомы і мардавання, а перад ім паўстануць новыя выклікі, якія стануць гуляць ім, як захочуць.

Шостая частка:

Пытанні, звязаныя з метадалогіяй

59. Іслам і вядзенне закліку

Неабходна адрозніваць рэлігію іслам ад ісламскага закліку. Іслам – гэта вечная, праўдзівая рэлігія Аллага. Яна не будзе зменена або скажоная. Што ж тычыцца вядзення ісламскага закліку, то гэта – сфера чалавечай дзейнасці, якая можа быць правільнай, а часам можа быць і памылковай.

Рэлігія Аллага беззаганная, а чалавечая дзейнасць дзеля гэтай рэлігіі – не. Дасканаласць і беспамылковасць ісламу не можа распаўсюджвацца на чалавечую дзейнасць, а памылкі і недахопы пры вядзенні закліку не могуць распаўсюджвацца на іслам.

60. Найлепшая метадалогія

Самай лепшай метадалогіяй для вядзення ісламскага закліку з'яўляецца дакладнае і яснае азнаямленне людзей з асноўнымі прынцыпамі ісламу. Такі падыход з большай верагоднасцю можа данесці да розуму чалавека патрэбную інфармацыю. Менавіта таму, ведучы заклік, варта пазбягаць тэмы дыскусій і рознагалоссяў. Таксама не трэба заводзіць гаворку пра аблудныя секты, думкі і плыні. Калі ж у такой размове ёсць крайняя патрэба, то варта згадаць аб гэтым мінімальна, не адхіляючыся ад асноўных прынцыпаў метадалогіі.

61. Вядзенне агульнага закліку

Пры вядзенні закліку варта казаць пра агульнапрызнаныя пытанні, пакідаючы ўбаку пытанні, адносна якіх існуюць рознагалоссі сярод правазнаўцаў, не кажучы ўжо аб рэдкіх і невядомых меркаваннях, адыходаў ад тэмы, празмернай колькасці варыянтаў і рознага роду верагоднасці здагадках. Для ўсяго вышэйпералічнага ёсць свой час, месца і аўдыторыя. Што ж тычыцца агульнага закліку, звернутага да звычайных людзей, то яго трэба весці з дапамогай практычных і карысных для іх пытанняў.

62. Прынцыпы Кур'ана – непахісныя пастулаты

Прынцыпы Кур'ана з'яўляюцца найвышэйшымі і адзінымі непарушнымі пастулатамі для ісламскага грамадства. Такі падыход павінен быць нязменным. Мусульманская супольнасць павінна пераймаць карысныя рэчы ад немусульман, пры ўмове, што іх карыснасць пацвердзяць годныя і вартыя даверу навукоўцы. Перавагу варта аддаваць шарыяцкім пастановам над рашэннямі арганізацыйнымі, таму што апошнія з'яўляюцца другаснымі і толькі сродкам для ўвасаблення ў жыццё шарыяцкіх пастаноў.

63. Пачынаць адтуль, дзе спыніліся іншыя

Мы заклікаем ўлічваць вопыт нашых папярэднікаў. Арганізацыя, цэнтр, навучальная установа або прапа-

веднік не павінны пачынаць усё з нуля. Варта разумець, што мы не першыя і не апошнія, хто нешта робіць для дасягнення гэтай высакароднай мэты.

64. Ясныя лозунгі

Нашы лозунгі пры вядзенні закліку павінны быць яснымі, рэалістычнымі, скаардынаванымі і аб'яднанымі адной ідэяй, якая б даходзіла да іх чытача. Два чалавекі павінны аднолькава разумець напісанае. У такога падыходу дзве асноўныя мэты. Першая – гэта адзінства разумення ўсіх тэарэтычных і практычных лозунгаў людзьмі, якія вядуць заклік. Другая – гэта выйсце з блытаніны і няяснасці, якая прысутнічае ў шэрагах прапаведнікаў, асабліва моладзі. Таксама такі падыход дазваляе выключыць памылковае тлумачэнне, якое можа прывесці да нязладжаных намаганняў, да патурання злу або да празмернасці, да смуты або да раскола.

65. Дакладная тэрміналогія

Мы павінны клапаціцца аб тым, каб сярод нас была свая, максімальна адапаведная Кур'ану, тэрміналогія. Яна павінна быць дакладнай, яснай і самастойнай. Мы мусім падыходзіць да яе выбару ўважліва і мудра, асцерагаючыся адносіць да ісламу тую ці іншую плынь, дзелячы рэлігію напапалам словамі, што ў ісламе ёсць сацыялізм, капіталізм, дэмакратыя ці штосьці яшчэ, што яму не ўласціва[10].

Іслам гэта іслам, з яго крытэрыямі, прынцыпамі, асновамі і мэтамі. Тое, што некаторыя існуючыя ідэалогіі або каштоўнасці супадаюць з ісламам, лішні раз дака-

[10] Маецца на ўвазе, што ісламская сацыяльна-эканамічная і палітычная сістэма цалкам самастойная і не запазычвае ад іншых нічога, што не адпавядае нормам ісламу.

звае яго ўніверсальнасць. Але такое супадзенне не дае права сцвярджаць, што ісламу адпавядае якаясьці ідэалагічная плынь. Бо іслам з'яўляецца асноўным, а ўсё астатняе – другасным. Іслам нязменны, а ўсё астатняе змяняецца. Іслам цалкам з'яўляецца ісцінай, у адрозненне ад усіх астатніх паняццяў, якія нясуць у сабе толькі пэўную долю праўдзівасці.

Такое разуменне вымагае нас перасцерагчы ад прымянення да ісламу сумнеўных тэрмінаў, якія сёння з'яўляюцца, а заўтра знікаюць; знешні сэнс іх можа быць добрым, але іх сутнасць можа быць аблудай. З прычыны свайго невуцтва або жадання дагадзіць навакольным, некаторыя прапаведнікі ашукаліся гэтым.

66. Развіццё ўсведамлення магчымай рызыкі

Ісламская супольнасць, адразу ж пасля яе з'яўлення, стала мішэнню [для нядобразычліўцаў] з-за таго, што яна нясе ў сабе Боскае пасланне і заклікае да яго. Менавіта таму над ісламскай супольнасцю заўсёды вісіць пагроза непрыемнасцяў ад нядобразычліўцаў, бо большасці з іх ісціна недаспадобы. Таму нам трэба ўмацоўваць свядомасць нашых прадстаўнікоў. Гэты стан стымулюе нас заклікаць да згуртавання і да пакідання рознагалоссяў. Таксама варта адзначыць, што любы вернік без выключэння можа сутыкнуцца з непрыемнасцямі. Нядбайнасць у адносінах да гэтай рызыкі толькі ўзмацняе яе. Складанасці бываюць двух відаў: знешняя, якая зыходзіць звонку, і ўнутраная, якая зыходзіць з шэрагаў мусульман. Урокі гісторыі паказваюць, што ўнутраная пагроза нашмат больш згубная і жахлівая, чым знешняя.[11]

[11] Маецца на ўвазе рознага роду невуцтва, грубасць, інтрыгі і варожасць, якія часцей за ўсё ўзнікаюць сярод крывадушных мусульман.

67. Шчырасць і правільнасць

Шчырасць займае ў ісламе вельмі высокае становішча, бо яна ўвасабляе сабою дух учынкаў і адну з умоў іх прыняцця. Учынак, які быў здзейснены без шчырасці, без сумневу, з'яўляецца страчаным. Але адной толькі шчырасці недастаткова. Напрыклад, нейкі ўчынак можа быць шчырым, але няправільным. Таму пры вядзенні закліку варта аб'ядноўваць шчырасць і правільнасць. Гэтыя два складнікі разам з'яўляюцца шляхам да поспеху.

Прапаведнікі павінны ўсведамляць вартасць правільнасці, заахвочваць і заклікаць да яе гэтак сама, як яны заклікаюць да шчырасці. Першай прычынай важнасці такога падыходу з'яўляецца тое, што правільнасць – гэта ўмова і родны брат поспеху. Другой прычынай з'яўляецца тое, што абсалютная большасць прапаведнікаў, якія вядуць заклік да ісламa, з'яўляюцца добрымі і шчырымі людзьмі. Менавіта таму вельмі часта іх могуць выкарыстоўваць у сваіх мэтах, падманваць і тлуміць іншыя людзі.

Часам прапаведнікі не шкадуюць сілаў у важных пытаннях, пры гэтым пакідаючы ўбаку яшчэ больш важныя. Часам яны шчыруюць дзе не трэба, а часам нават празмерна і ахвяруюць сабой там, дзе гэта недарэчы. У такім выпадку прапаведнікі могуць стаць першымі ахвярамі смуты, што толькі пагоршыць сітуацыю.

68. Натхнёнасць у меру

Натхнёнасць, або энтузіязм – гэта выдатная якасць, якая вядзе да распальвання духу рашучасці, эфектыўнасці, ініцыятывы, руплівасці, спаборнасці, альтруізму, дасціпнасці і іншых пахвальных якасцяў, што, у сваю

чаргу, рухае наперад ісламскі заклік. Пры наяўнасці натхнення ісламская дзейнасць ідзе наперад. Калі ж энтузіязму бракуе, аслабляецца і ісламскі заклік. Зыходзячы з вышэйзгаданага, прапаведнікі распальваюць іскры натхнення. І правільна робяць.

Але пры гэтым варта ўлічваць дзве важныя ўмовы. **Першая ўмова:** мера натхнення павінна быць дакладна разлічанай, як лекі, якія лекар хвораму прапісвае строга па рэцэпце. Бо празмерны рост натхнення, асабліва ў моладзі, можа прывесці да з'яўлення фанатызму і раздражнення. Што, у сваю чаргу, прывядзе да памылковага шляху.

Другая ўмова: мудры прапаведнік павінен падрыхтаваць для тых, у кім заўважна карысная натхнёнасць, правільныя шляхі рэалізацыі іх імкненняў, каб яны адчулі сябе карыснымі. Такія людзі робячы ўсё, што ў іх сілах, пазбягаюць згрызот сумлення, якія могуць іх ахапіць, калі яны не прыкладуць належных намаганняў. У выніку, энтузіясты адчуваюць радасць і спакой, прыносячы карысць навакольным і дорачы ім шчасце.

69. Мужнасць рухацца наперад

Мужнасць – гэта вялікая якасць, якая абавязкова павінна быць у прапаведніка. Мужнасць з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў вядзення ісламскага закліку. Усялякі заклік, якому спадарожнічае мужнасць, няўхільна ідзе да поспеху. І любы заклік, у якім няма мужнасці, няўхільна ідзе да паразы. Але праява мужнасці павінна быць абдумана, абгрунтавана і правільна выкарыстана ў адносінах да становішча, каб стаць прычынай руху наперад. Гэта і будзе мудрасцю, тады як грэбаванне гэтым і патрабаваннямі будзе бязглуздасцю.

70. Мужнасць адступіць

Там, дзе трэба, варта рухацца наперад, а там, дзе трэба, варта адступіць. Але толькі аўтарытэтнае кіраўніцтва можа прыняць рашэнне аб адступленні. Мужнасць будзе пахвальнай у абодвух выпадках. Пры гэтым мець мужнасць адступіць важней, чым мець адвагу рухацца наперад. Бо навакольныя звычайна ўхваляюць чалавека, які прыняў рашэнне ісці наперад, а чалавека, які прыняў рашэнне адступіць, людзі часцяком не разумеюць і вінавацяць. Пры гэтым яны забываюцца пра тое, што такі чалавек глядзіць далей, за энтузіязм і бесклапотнасць навакольных.

Выдатны паплечнік Прарока Халід ібн аль-Валід (хай будзе задаволены ім Аллаг) у бітве пры Мута абраў для сябе мужнасць адступіць. Ён меркаваў так: калі яго армія пойдзе наперад, то будзе асуджаная на пагібель. Менавіта таму Халід ібн аль-Валід (хай будзе задаволены ім Аллаг) адступіў і вярнуўся ў Медзіну, хоць і быў адным з самых мужных і дасведчаных людзей свайго часу. У той дзень некаторыя маладзёны далі яму мянушку "фуррар" ("уцякач"), але сам Пасланец Аллага (мір над ім і дабраславенне Аллага) пахваліў яго, назваўшы "куррар" ("той, хто атакуе").

Менавіта таму мужнасць адступіць была правільным рашэннем для Халіда ібн аль-Валід (хай будзе задаволены ім Аллаг), а мужнасць наступаць была б у яго выпадку памылкай.

71. Неабходны спакой

Мы заклікаем перастаць раздражняцца і стаць мудрымі; перастаць помсціць і стаць цярплівымі; пераста-

ць праяўляць нядбанне ў пытаннях сегасветнага жыцця і стаць прафесіяналамі, дасведчанымі, здольнымі выправіць і супольна адбудаваць яго наноў.

72. Значэнне мае змест, а не форма

Калі пад уплывам абставін спатрэбіцца змяніць нейкую назву, то прапаведнікі павінны зрабіць гэта. Але гэтае змяненне не павінна прывесці да змены сутнасці.

У часы пашырэння ранняга халіфату адно з хрысціянскіх плямёнаў пагадзілася на падначаленне мусульманам, але не жадала выплочваць падушны падатак *(джыз'ю)*. Пры гэтым хрысціяне былі згодны на выплату, якая б называлася "міласціна". У назве першага падатку гэтае племя бачыла знявагу[12]. Тады вялікі правіцель Умар ібн аль-Хатаб (хай будзе задаволены ім Аллаг) загадаў пайсці на іх умовы. Таму што паплечнікі глядзелі на змест, а не на форму. Дадзены падыход з'яўляецца адным з многіх унікальных рашэнняў Умара ібн аль-Хаттаба (хай будзе задаволены ім Аллаг).

73. Нашае грамадства з'яўляецца мусульманскім, але...

Наша грамадства з'яўляецца мусульманскім. Любыя пралікі, няправільныя практыкі, новаўводзіны або памылкі, якія назіраюцца ў ім, не даюць падставы называць яго "грамадствам нявер'я" або "грамадствам часоў невуцтва".[13]

Так, можна тыя ці іншыя з'явы, якія існуюць у мусульманскім грамадстве, назваць прыкметамі грамад-

[12] Слова "джыз'я" ў арабскай мове мае лексічнае значэнне "спагнанне, штраф".

[13] Аўтар крытыкуе тут погляды ідэалогіі такфірызма, якая навешвае на людзей ярлык "паганцаў (шматбожнікаў)", з-за чаго абсалютна ўсе людзі абвяшчаюцца няверніками з усімі пачварнымі наступствамі гэтага.

ства невуцтва. Але гэта адносіцца толькі да часткі грамадства, а не да яго ўсяго.

Аднойчы Пасланец Божы (мір над ім і дабраславенне Аллага) сказаў, што некаторыя ўчынкі вядомага паплечніка Абу Зарра (хай будзе задаволены ім Аллаг) маюць пэўныя прыкметы часоў невуцтва, калі апошні назваў Біляля сынам чарнаскурай жанчыны[14]. Этыка Пасланца Божага (мір над ім і дабраславенне Аллага) не дазволіла сказаць: "Ты – прадстаўнік грамадства часоў невуцтва!". Пры гэтым Пасланец Божы (мір над ім і дабраславенне Аллага) абраў лепшы выраз, паказаўшы на тое, што ва ўчынках Абу Зарра (хай будзе задаволены ім Аллаг) засталося нешта з часоў невуцтва. Абу Зарр адразу ж зразумеў сваю памылку, выракся гэтай якасці і выбачыўся перад Білялем. Такім чынам, некаторыя прыкметы, якія засталіся ў чалавека з часоў невуцтва, не выводзяць яго з ісламу.

Менавіта такім ёсць нашы грамадствы сёння. У іх існуюць і станоўчыя з'явы, і з'явы, якія можна назваць прыкметамі часоў невуцтва. Яны адрозніваюцца па характары і ступені, залежаць ад месца і часу. Але, пры ўсім гэтым, грамадства застаецца мусульманскім. І прапаведнікі павінны несці асвету ў сваё грамадства, спрабуючы выбавіць яго ад дрэнных з'яў і паясняючы, што паўната ісламу заключаецца менавіта ў гэтым.

74. Новыя вернікі

Натуральна, што кожны мусульманін рады новаму чалавеку, які прыняў іслам. Але часам гэтая радасць пераходзіць межы дазволенага і прымушае нас рабіць памылкі – хоць іх і можна пазбегчы. І калі мы будзем імкнуцца да гэтага, то будзе карысць і нам, і новым му-

[14] Што было расцэнена Прарокам, мір над ім, як абра'за (Біляль быў эфіёпам).

сульманам. Каб пазбавіцца ад магчымай памылкі, нам варта пераканацца ў намеры новага мусульманіна, у цвярозасці яго розуму, у яго жаданні выконваць нормы ісламу, у яго мудрасці, і толькі пасля гэтага дапамагчы яму ў меру, пакуль ён не ўмацуецца ў ісламе сваімі намерамі, разуменнем, ладам жыцця. Усё павінна ісці сваёй чаргой і развівацца паступова і спакойна. Калі ж мы станем празмерна вітаць новага мусульманіна, то гэта можа разбэсціць яго, ператварыўшы яго ў папрашайку або ў чалавека, зачараванага самазахапленнем і ўяўленнямі, нібыта ён стаў настаўнікам, у якога трэба вучыцца, а яму вучыцца няма чаму.

75. Перамогі і паразы

Ісламская гісторыя бачыла мноства феерычных перамог. У архівах вядзення ісламскага закліку таксама існуе мноства годных старонак, якія абуджаюць гонар. Усё гэта можа паслужыць моцным матывам для ўмацавання духу практычнай працы, вартага пераймання ў будучыні. Але ўсё гэта можа мець і негатыўную ролю, усяліць дух бяздзейнасці і бяссілля, і заахвоціць абмежавацца одамі ды ўслаўленнямі. Можна з упэўненасцю сказаць, што негатыўныя высновы, якія былі зробленыя з ісламскай гісторыі і вядзення закліку, з'яўляюцца памылковымі. Урокі гісторыі могуць мець як пазітыўную, так і негатыўную ролю ў вядзенні ісламскага закліку.

76. Стаўленне да хадзісаў, у якіх сказана пра смуту і бітвы

Іслам – захаваная і пераможная рэлігія. Будучыня будзе за ісламам. Пра гэта гаворыцца ў шматлікіх аятах Кур'ана і хадзісах Прарока, мір над ім. Таксама гэта пацвярджаюць падзеі рэчаіснасці і перадумовы будучыні.

Прапаведнікі павінны быць цалкам упэўнены ў гэтым. Менавіта такая ўпэўненасць дапаможа прапаведнікам ў парадкаванні іх дзейнасці і здабыцці імі перамогі.

Варта адзначыць, што большасць хадзісаў, у якіх гаворыцца пра набліжэнне смут і бітваў, з'яўляюцца слабымі. Вартыя даверу хадзісы, у якіх гаворка ідзе пра паступовае пагаршэнне спраў мусульманскай супольнасці, апісваюць пэўныя асаблівасці часу, мясцовасці альбо асобаў, без дакладнай канкрэтызацыі. Нельга абагульняць сэнс гэтых хадзісаў, прывязваючы іх да чагосьці канкрэтнага. Інакш гэта прывядзе да супярэчнасці з яснымі пэўнымі шарыяцкімі тэкстамі, які абяцаюць перамогу. Гэткі падыход не будзе адпавядаць універсальнаму Боскаму закону, гістарычным падзеям, а таксама будзе супярэчыць справядлівасці Аллага. Усявышні вышэй за тое, каб абавязаць людзей дапамагаць Сваёй рэлігіі і паабяцаць ім дапамогу, а потым без дай прычыны засмуціць іх паразай. І менавіта таму мы павінны ўсвядоміць, што асабістае трэба разумець у святле агульнага, а меркаванае – у святле катэгарычнага. Мы прымаем вартыя даверу хадзісы, у якіх гаворка ідзе пра надыход смут, і глядзім на іх скрозь прызму перакананасці ў пераможнасці ісламу, з дазвалення Усявышняга.

77. Будучыня – за ісламам

Іслам з'яўляецца пераможнай рэлігіяй, таму што ён нясе ў сабе апошняе пасланне Аллага людзям. Сам Усявышні паабяцаў перамогу Сваёй рэлігіі.

Вядома, мусульманская супольнасць час ад часу праходзіць складаныя этапы. Але яе праўдзівыя перакананні, шырокія землі, валоданне стратэгічна важнымі рэсурсамі і разнастайнымі вялікімі багаццямі і

няспыннае развіццё насельніцтва заўжды бяруць верх над яе слабымі бакамі. Ісламская супольнасць зноў зойме пачэснае становішча, і даўняя гісторыя з'яўляецца лепшым доказам гэтага. Калі б гэткія пагібельныя бедствы адбыліся з любой іншай супольнасцю, яна абавязкова цалкам бы знікла з твару зямлі.

Такім чынам прапаведнікі заўсёды павінны падбадзёрваць мусульман. Гэтыя словы адганяюць адчай, сеюць надзею і падахвочваюць да дзеяння. Падбадзёрванне павінна ісці поруч з заклікам прыкладаць належныя намаганні для дасягнення пастаўленай мэты. Боская заканамернасць у тым, што перамога не даецца задарма тым, хто проста так адседжваецца.

Сёмая частка:

Мэты і сродкі

78. Мэты і сродкі

Асноўныя мэты нязменныя, а другасныя – могуць змяняцца ў залежнасці ад этапу. Варта адзначыць, што і сродкі дасягнення мэтаў павінны пастаянна абнаўляцца і развівацца. Неабходна запазычваць станоўчы досвед мусульман і немусульман. Мудрасць з'яўляецца зброяй верніка. Таксама варта адзначыць, што кожны сродак для вядзення закліку трэба выкарыстоўваць у адпаведнасці з двума прынцыпамі.

Першы прынцып: павінна быць неабходнасць у тым ці іншым сродку да пачатку яго выкарыстання.

Другі прынцып: выкарыстоўваць той ці іншы сродак трэба толькі калі плюсаў ад яго будзе больш, чым мінусаў, калі ж будзе інакш – то не. І таксама трэба стараца, каб мэты засталіся мэтамі, а сродкі – сродкамі. Небяспечна, калі мэта робіцца сродкам, а сродак – мэтай. Такое ўжо бывала ў нашай гісторыі і культуры.

79. Надаваць увагу выдатным асобам

Мы перакананыя, што трэба засяродзіцца на самых выдатных і адораных студэнтах. Яны з'яўляюцца рухавікамі прагрэсу, абнаўлення, мыслення і прадвеснікамі будучыні.

80. Этыкет вядзення дыялогу

Мы заклікаем да вывучэння этыкету вядзення дыялогу. Таму што дыялог з'яўляецца адным з важнейшых і эфектыўных спосабаў закліку. Паспяховы суразмоўца ўмее па-майстэрску абараніць прынцып, да якога ён заклікае.

81. Калі варта заняцца менш важнымі справамі

Розныя людзі аддаюць перавагу розным аспектам у ісламскім праве або пры вядзенні закліку. Гэта залежыць ад шэрагу варункаў, становішчаў, разумення і ведаў чалавека. Навязваць сваю думку і выбар іншым – зусім не праява мудрасці, хоць чалавек можа быць пераканаы ў сваёй праваце і ў аблудзе астатніх. Аб'яднацца на проста правільным лепш, чым дзяліцца на падставе чагосьці больш правільнага. Дапамагаць адзін аднаму ў добрым лепш, чым сварыцца з-за лепшага.

82. Неабходная радасць

Радасць у межах дазволенага з'яўляецца адным з найважнейшых спосабаў умацаваць сувязі паміж моладдзю і супольнасцю. Радасныя падзеі даюць магчымасць новаму пакаленню зразумець руплівасць аб ім і шчырасць да яго, а таксама лепш пранікнуцца ладам іх мыслення. Менавіта таму мы заклікаем не саромецца выказваць сваю радасць на розных імпрэзах, святах, прыкладам, напачатку і напрыканцы навучальнага года. Для лепшага данясення радасці варта ладзіць

імпрэзы, выконваць нашыды[15], праводзіць конкурсы, ладзіць спартовыя спаборніцтвы, дарыць прызы і падарункі і г.д.

83. Не напаказ

Усявышні Аллаг сказаў у Кур'ане:

﴿ ادْعُ إِلَى سَبِيلِ رَبِّكَ بِالْحِكْمَةِ وَالْمَوْعِظَةِ الْحَسَنَةِ وَجَادِلْهُم بِالَّتِي هِيَ أَحْسَنُ ﴾

"Заклікай на шлях Госпада мудрасцю і добрым угаворам і вядзі спрэчку з імі найлепшым чынам" (Сура "ан-Нахль", аят 125).

Усявышні таксама сказаў:

﴿ وَلَا تُجَادِلُوا أَهْلَ الْكِتَابِ إِلَّا بِالَّتِي هِيَ أَحْسَنُ إِلَّا الَّذِينَ ظَلَمُوا مِنْهُمْ ﴾

"Калі ўступаеце ў спрэчку з людзьмі Пісання, то вядзіце яе найлепшым чынам, акрамя тых з іх ліку, якія паводзяцца несправядліва" (Сура "аль-Анкабут", аят 46).

Мы заклікаем зачыніць дзверы абмеркавання тэарэтычных пытанняў і дыскусій, якія не маюць дачынення да рэальнага жыцця. Мы заклікаем пакінуць дэвіянтныя меркаванні, нязвыклыя рашэнні і здагадкі, таксама прапануем пакінуць грубыя спрэчкі, бо ўсё гэта толькі марнуе час, намаганні, маёмасць, адцягваючы чалавека ад нясення сапраўднай адказнасці. Таксама вышэйзгаданыя пытанні, часцей за ўсё вядуць да ўзаемнай нянавісці, разладу і адчужэння. Калі ўсё ж неабходна

[15] Песні на рэлігійную тэматыку без інструментальнага суправаджэння.

абмеркаваць такія пытанні, то гутарыць на гэты конт належыць найлепшым чынам, прытрымліваючыся настаўленняў Святога Кур'ана.

84. Важнасць вывучэння арабскай мовы

Арабская мова з'яўляецца сховішчам ведаў і спазнання, а таксама першакрыніцай ісламскай цывілізацыі. Таму лад мыслення, заснаваны на веданні арабскай мовы, увогуле дае больш правільнае разуменне шарыяцкіх тэкстаў, чым лад мыслення мусульманіна, які не валодае ёй. Арабская мова ў пытаннях жыцця мае агульныя рысы з іншымі мовамі, але пры гэтым мае адну адметную рысу: Аллаг абраў арабскую мову для Свайго Святога Пісання. Аллаг лепш ведае, як, дзе, каму і на якой мове пасылаць Сваю Кнігу. Таксама арабская з'яўляецца мовай Прачыстай Суны і большай часткі ісламскае спадчыны. Вывучэнне гісторыі ісламу паказвае, што ў тых краінах, дзе іслам распаўсюдзіўся разам з арабскай мовай, гэта стала прычынай лепшага разумення і ўмацавання рэлігіі. Так было нават пасля знікнення ці аслаблення ўлады мусульманскага правіцеля. З улікам усяго вышэйсказанага, нам варта па меры нашых магчымасцяў імкнуцца распаўсюджваць арабскую мову, засяродзіўшы свае намаганні на мусульманскіх неарабскіх краінах і на ўсім свеце увогуле.

85. Сродак і мэта

Канчатковай мэтай ісламскага закліку з'яўляецца ўзвышэнне Слова Аллага і настаўленне людзей на шлях ісламу. Такая важная і годная мэта мае патрэбу толькі ў годных сродках. Гэты прынцып прымушае нас перасцерагчы ад вядомага ў палітычных колах правіла, якое вывеў італьянскі палітычны дзеяч Макіявелі: "Мэта

апраўдвае сродкі". Сэнс яго палягае ў тым, што *для* дасягнення годнай мэты можна выкарыстаць *любы*, нават самы заганны сродак. Гэта катэгарычна непрымальна ў ісламе ні на якім узроўні. Але нягледзячы на гэта, некаторыя мусульмане ўспрынялі гэта "правіла", якое з'яўляецца ўвасабленнем зла. Яшчэ больш варта жалю прыняцце на ўзбраенне гэтага "правіла" некаторымі рухамі, якія прыпісваюць сябе да ісламскага закліку. У выніку здараецца бяда ці нават шэраг бедаў. Ісламскі заклік не павінен мець дачынення да гэтага сцверджання, яму належыць аддаліцца ад усіх, хто яго практыкуе і перакрыць ўсе шляхі для яго.

Восьмая частка:

Перасцярогі у пытанні метадалогіі

86. Пакліканне, а не рамяство

Калі вядзенне ісламскага закліку ператворыцца з паклікання ў рамяство, як гэта часта бывае, то форма возьме верх над сутнасцю, бяздзеянне – над эфектыўнасцю, эгаізм над альтруізмам, самазванцы – над прафесіяналамі, крывадушнікі – над праўдзівымі людзьмі. Усё гэта з'яўляецца вялікай бядою, якая так ці інакш абрынаецца на галовы прапаведнікаў. Такое становішча спраў аддаляе мусульман ад ісламскага закліку і дае моцную зброю ў рукі яго няпрыяцеляў.

87. Адзінае кіраўніцтва

Варта перасцерагчы ад сітуацыі, калі пры вядзенні ісламскага закліку існуе два лідары: адзін фармальны, а другі нефармальны. Фармальны лідар проста выконвае ролю лідара, а нефармальны – сапраўды кіруе справамі. Фармальны лідар – усяго толькі абгортка, а нефармальны – сутнасць. Атрымліваецца, што на самой справе рашэнні прымае нефармальны лідар, абавязваючы да іх выканання фармальнага. Такое становішча спраў з'яўляецца падманам і няпраўдай, і відавочна супярэчыць прынцыпам вядзення ісламскага закліку. Асабліва гэта шкодзіць прынцыпу нарады, надаючы законную форму рашэнням, якія супярэчаць закону. Больш за тое, гэта па сутнасці сапраўдная дыктатура.

У выніку нефармальны лідар глядзіць на фармальнага з пагардай і фанабэрыстасцю, а фармальны – глядзіць на свайго апанента з зайздрасцю і злосцю. Фармальны лідар у такім выпадку выглядае слабым і баязлівым у вачах калектыву. Усё вышэйпералічанае вядзе да варожасці, злосці, правалу і паразы. Ісламскі заклік, які вядзецца пад такім падвойным кіраўніцтвам, можа заплаціць горкую цану.

88. Падманныя змяненні

Нават слова "змены" сее зярняты любові сярод прапаведнікаў і ва ўсіх астатніх людзей. Пры гэтым людзі не задаюцца пытаннем, правільныя гэта змены ці не? Неабходна пераканацца ў тым, што яны не прывядуць да горшага становішча, чым было да іх. Старажытны паэт пісаў:

Амаль што цэлы дзень я слёзы ліў панура,
Калі ж наступны дзень прыйшоў,
Заплакаў зноў , бо слёз часы мінулі.

Геніяльны паплечнік Амр ібн аль-Ас (хай будзе задаволены ім Аллаг) сказаў: "Жорсткі правіцель лепш за няспынную смуту". Гэтымі словамі Амр ібн аль-Ас (хай будзе задаволены ім Аллаг) не ўхваляе несправядлівае праўленне, але, ведаючы вынікі анархіі, перасцярог ад іх.

89. Адказная рэакцыя

Мы перасцерагаем ад рэакцыі ў адказ, якую часам дазваляюць сабе некаторыя праведнікі. Калі яны бачаць, што нехта няправільна разумее тое ці іншае пытан-

не або дазваляе сабе няправільныя паводзіны, то ганяць людзей больш, чым варта, моцна звужаючы шырокія межы дазволенага.

90. Ментальная спешчанасць

Распешчанасць – небяспечная з'ява, звязаная з нямэтавым выкарыстаннем сродкаў. Яна шкодзіць ўсім сферам жыцця. Таму іслам супрацьстаіць спешчанасці, лічачы яе распаўсюд сярод пэўнага народу прыкметай яго блізкага канца. Прапаведнікі павінны супрацьстаяць распешчанасці і змагацца з ёй.

Існуе іншы від спешчанасці, магчыма, яшчэ больш небяспечны, чым матэрыяльная. Гэта ментальная спешчанасць. Яна заўважная ў некаторых прапаведнікаў або ў людзей, якія лічаць сябе прапаведнікамі. Такое бывае ў тых, хто паглыбляецца ў вывучэнне даўно зніклых сект, чые аблудныя перакананні сёння аніяк не шкодзяць супольнасці вернікаў; і тых, хто піша цэлыя раздзелы або нават кнігі, пры чытанні якіх абсалютна не зразумела, што хацеў сказаць аўтар. Часам такое можа здарыцца з тым, хто проста збірае інфармацыю з розных крыніц, ніяк не карыстаючыся сваім розумам, каб адрозніць вартае даверу ад непраўдзівага. Такі чалавек нібы хоча запэўніць чытача, што ён добра разбіраецца ў апісаных пытаннях, што яго звесткі шырокія, каб той пайшоў за ім. Ментальная спешчанасць уласціва тому, хто піша завуалявана, імкнучыся паказаць "глыбіню" сваёй думкі, якой ніхто не можа нічога супрацьпаставіць. Такое можа ўзнікнуць і па іншай прычыне.

Вышэйзгаданае з'яўляецца толькі сціплым прыкладам ментальнай спешчанасці. Гэта распешчанасць падобная на матэрыяльную, калі не горш за яе. Шчырым прапаведнікам варта перасцерагаць ад яе, бо ментальная спешчанасць вядзе да марнавання часу, сілаў, ма-

ёмасці і страты Божай узнагароды. Гэта ганебнае дэзерцірства ад сапраўднай адказнасці. Часам гэта можа нават прывесці да абагаўлення, неадчэпных думак і выпрабавання ад Усявышняга шляхам спакушэння з гэтага боку. І трэба памятаць, што добры намер, калі ён наогул ёсць, ніяк не мяняе згубных наступстваў.

91. Фанатызм і прыхільнасць

Натуральна, што прапаведнік абірае метад вядзення закліка з улікам яго адметных рысаў, якія робяць яго больш прывабным за іншыя. Пры гэтым прапаведніку нельга прэтэндаваць на бясхібнасць абранага ім сродку і не пагарджаць сродкамі закліку, абраных іншымі. Такое з'яўляецца дазволенай, ухвальнай і абавязковай прыхільнасцю. Калі ж прапаведнік збочыць з такога шляху, то трапіць у ганебны фанатызм, забаронены ў ісламе, які можна назваць і невуцтвам.

Усё гэта заўжды нагадвае нам, што праўдзівай мерай годнасці з'яўляецца богабаязнасць і праведныя ўчынкі. Натуральна, што трэба пакінуць ўсе праявы сляпой прыхільнасці, пачатак якім пакладзены ў даісламскую эпоху невуцтва: ура-патрыятызм, нацыяналізм, адданасць пэўнай партыі ці нейкай іншай групе людзей.

92. Веліч, але ўсё ж...

Адмова верніка да ўсіх праяваў хлусні з'яўляецца ўхвальнай рысай, якая паказвае на стан яго сэрца і розуму, яго спадзяванне на Аллага і абсалютную ўпэўненасць у праўдзівасці рэлігіі, да якой ён заклікае.

Але пры гэтым вернік можа патрапіць у страшную памылку, калі яго пагарда да хлусні ператворыцца ў пагарду да тых, каго ён заклікае. Праява такой пагарды з'яўляецца скажэннем і адной з пастак нізкай душы

(нафсу), якая падштурхоўвае да думкі, што прапаведнік лепшы за навакольных, і таму яму нібыта не варта знацца з імі, каб не збэсціць сваю чысціню. Такі чалавек не мае нічога агульнага з заклікам.

Прапаведнік павінен пагарджаць хлуснёю, а не тымі, каго ён заклікае. Наадварот, ён павінен быць удзячным Аллагу за тое, што Ён ушанаваў яго і даў магчымасць служыць Яго рэлігіі. Прапаведнік павінен любіць і цярпець людзей, і зычыць ім дабра ад шчырага сэрца. Толькі так ён зможа накіраваць пачуццё асабістай перавагі ў правільнае рэчышча і засцерагчыся ад подлай пасткі, якую прыгатавала для яго ягоная ўласная душа. Толькі перавага руху за ісцінай і прынцыпамі веры з'яўляецца правільнай, а не перавага следавання за пэўнай асобай або партыяй.

93. Традыцыі – не рэлігія

Часам у некаторых людзей традыцыі і звычаі могуць заняць месца рэлігіі, не маючы ніякага дачынення да яе. Такое бывае падчас радасці і смутку, пры ажыццяўленні грамадскіх стасункаў у цэлым і ў стаўленні да жанчыны ў прыватнасці. Менавіта таму мы павінны праводзіць мяжу паміж традыцыямі і рэлігіяй. Пры гэтым традыцыю варта прымаць ці адрынаць, грунтуючыся на рэлігіі.

94. Адступленне, заняпад і млявасць

Некаторыя прапаведнікі ў сваіх размовах часцяком паглыбляюцца ў велічнае мінулае мусульманскай супольнасці, падкрэсліваючы сваю прыналежнасць да яго. Пры гэтым яны не робяць належнага, мяркуючы, што адных толькі размоў будзе дастаткова. Такія люд-

зі не прымаюць удзел ў прадуктыўных кроках для выпраўлення сучаснасці і пабудовы будучыні.

Ёсць і такія прапаведнікі, якія паглыбляюцца ў тэму сённяшняшніх цяжкасцяў мусульманскай супольнасці. Яны скардзяцца, плачуць, папракаюць і кідаюць сваіх паслядоўнікаў у розныя бакі – калі трэба і калі не. Пры гэтым яны не робяць належнага, мяркуючы, што, пагаварыўшы, яны знялі з сябе адказнасць. Такія людзі кідаюцца з галавой у абдымкі адчаю і спрэчак, не прыкладаючы аніякіх высілкаў у сваім жыцці. Яны не адчуваюць адказнасць паслання, з дапамогай якога Аллаг ушанаваў і ўзвысіў іх над усімі астатнімі стварэннямі!

Таксама ёсць і трэці від прапаведнікаў, якія цалкам аддаюцца марам пра будучыню, нічагуткі пры гэтым не робячы. Яны чакаюць прышэсця нейкага правадыра-рэфарматара, чаканага Магдзі, кіраўніка або героя-выратавальніка, які ўсіх аб'яднае. Яны лічаць, што прышэсце такога чалавека вырашыць усе праблемы і ажыццявіць усе надзеі, пры гэтым не бяруць у разлік законы жыцця, укладзеныя ў яго Аллагам. Тым самым, губляецца ўвесь сэнс і каштоўнасць дзейнасці чалавека.

Усе тры вышэйзгаданыя віды людзей насамрэч бягуць ад адказнасці, якую яны здольныя панесці, шукаюць непрымальныя апраўданні, распісваючыся ва ўласнай няздольнасці і падманваюць саміх сябе. Усё гэта з'яўляецца грузам і цяжарам як для вядзення ісламскага закліку, так і для звычайнага жыцця.

Мусульманіну неабходна ведаць тое, да чаго ён заклікае, разумець сучаснасць і ўсведамляць уласныя магчымасці, выконваючы іх прафесіянальна і шчыра. Крок за крокам можна дайсці да мэты, кропля за кропляй – і ўтворыцца рака. Калі Аллаг ўбачыць, што Яго рабы шчыра і прафесійна выконваюць сваю працу, якой бы вялікай ці малой яна ні была, то гэта прынясе мусульманскай супольнасці самы лепшы плён.

95. Марнаванне часу

Некаторыя прапаведнікі, трапляючы ў павуцінне пастак, расстаўленых нізкаю натурай, марнуюць час на розныя сустрэчы, лічачы, што займаюцца карыснымі справамі. Яны занятыя размовамі пра падзеі на Усходзе і Захадзе, абвяргаюць то аднаго, то другога. Гэтыя людзі абрынаюць свой гнеў на адно з пытанняў, самазаспакойваючыся адносна іншага. Так і мінае іх час без усялякай плённай дзейнасці. Яны пераканаяныя, што бавячы час гэткім чынам, апраўдаюцца перад сваім Госпадам. Бо, на іх думку, яны прынеслі рэлігіі Аллага пасільную дапамогу, хоць насамрэч гэта не так. Наадварот, яны падманулі саміх сябе, марнуючы вольны час у задавальненні уласнай прыхамаці да балбатні.

Гэта актыўнасць з'яўляецца зманлівай і не прыносіць аніякай карысці рэлігіі. Такія людзі падманваюць саміх сябе і навакольных. Яны хваляць іншых за тое, што тыя хваляць іх. Такія дзеянні дазваляюць ім уцякчы ад сапраўдных абавязкаў, надаючы уласнай бяздзейнасці рэлігійную афарбоўку.

96. Крайняя марнасць

Намаганні многіх мусульман, і ў тым ліку прапаведнікаў, характэрызуюцца крайняй дарэмнасцю як у сегасветных, так і ў рэлігійных справах. Такі падыход супярэчыць ласцы, якую аказаў Аллаг, наканаваўшы мусульманам быць правадырамі чалавецтва і дойлідамі цывілізацыі. У мусульман ёсць правільнае веравучэнне, велізарныя багацці, стратэгічнае становішча і рост насельніцтва. Менавіта таму дальнабачныя мусульмане павінны даследаваць прычыну дадзенага пытання, каб астатнія вернікі змаглі перайсці ад бяздзейнасці да

эфектыўнасці, і ад недзеяздольнасці да дасягнення мэтаў. Магчыма, найважнейшымі якасцямі, якія спрыяюць гэтаму, адносяцца сур'ёзнасць, канструктыўнасць, самакрытычнасць, здаровая канкурэнцыя, прафесіяналізм, правільнае выкарыстанне магчымасцяў, калектыўная дзейнасць, матываванасць, адказнасць і любоў да працы.

97. Небяспека ўтойвання

Мы настойліва перасцерагаем ад небяспекі некарэктнага тлумачэння, скрытнасці і пошуку таемнага сэнсу думак і дзейнасці мусульман. Мы сцвярджаем, што іслам, яго прынцыпы і ідэі з'яўляюцца паўнавартаснымі і яснымі, у іх няма ніякага схаванага сэнсу або сакрэтнасці. Таксама да іслама нельга нічым дадаць.

Яснасць ісламскага веравучэння з'яўляецца яе моцным бокам. Іслам адкрыта заяўляе тое, чым ён ганарыцца. І толькі пасля гэтага людзі ўспрымаюць сваёй прыроджанай існасцю ясныя, відавочныя, зразумелыя і справядлівыя думкі іслама. Пры гэтым людзі адварочваюцца ад невыразных, схаваных, супярэчлівых і скажоных думак.

Схаваныя памылкі шкодяць тым, хто іх дапусціў больш, чым іх апанентам. Утоенасць знаходзіцца ў цемры і таму яе не відаць, у адрозненні ад відавочных памылак, якія адбываюцца навідавоку.

98. Небяспека абагульнення

Небяспека абагульнення распаўсюдзілася сярод некаторых прапаведнікаў. Напрыклад, заяўленне аб тым, што нейкія немусульманскія сілы абвясцілі вайну ўсім мусульманам; распаўсюд чутак пра тое, што ўсё, нібыта, у руках ворагаў ісламу; заява аб тым, што любая афіцыйная праца ў сферы рэлігіі з'яўляецца хітрасцю

і змовай супраць мусульман; што любая неафіцыйная дзейнасць нібыта з'яўляецца абсалютным дабром або цалкам правільнай; што росквіт або заняпад мусульманскай супольнасці знаходзіцца ў руках нейкай пэўнай групы і г.д.

Такое мысленне пазбаўлена рэалістычнасці і змястоўнасці. Наадварот, яно павярхоўнае, шаблоннае і паспешлівае. Такое мысленне аддаляе ад абавязковага пошука альтэрнатываў, рашэнняў і матывацый, усяляючы прыхільнікам такога мыслення пачуццё самаапраўдання, калі іх ахопіць лянота і бяздзейнасць. Гэтыя людзі лічаць, што яны супрацьстаяць непераможнай віхуры. Таксама гэткае мысленне супярэчыць закону ўзаемнага стрымлівання, які Аллаг уклаў у быццё.

Мусульманін абавязаны перасцерагаць ад падобных згубных абагульненняў, ён павінен адчуваць святло свайго розуму і неабыякавасць свайго сэрца. Верніку варта правільна аналізаваць падзеі, аддаваць ім належны прыярытэт, імкнуцца разабрацца ў прычынах, матывах і выніках. Мусульманін павінен разважаць над вырашэннем праблем, каб не патрапіць у палон ілюзій і не застацца сам-насам перад выбарам з двух узаемавыключальных варыянтаў: чорнае або белае, магчымае ці немагчымае, змяншэнне або павелічэнне і г.д.

99. Таемныя змовы

Апошнім часам часта сталі гаварыць пра нейкія таемныя змовы. Адны сцвярджаюць, што яны існуюць, іншыя ж абвяргаюць гэта.

Насамрэч рознага роду канспіралагічныя тэорыі існуюць ад пачатку існавання чалавецтва і застануцца да яго канца. Але нам ні з пункту гледжання рэлігіі, ні з пункту гледжання розуму не варта тлумачыць падзеі таемнымі змовамі. Нам трэба памятаць пра тое, што часам таемныя змовы бываюць паспяховымі, а часам

церпяць крах і могуць абярнуцца супраць саміх жа змоўшчыкаў. Мы павінны ставіцца да таемных змоваў спакойна, не падтрымліваючы ні адзін з бакоў. Такі падыход дазволіць нам заставацца ўбаку ад вядзення марнай барацьбы або бяздумнага падтаквання наваколь-ным. Таксама гэта дасць магчымасць нам не звязваць нашы ўласныя няўдачы і недзяздольнасць са змовамі.

Прынясенне марных ахвяраў, дрэнныя ўзаемаадносіны і няўважлівасць да першапрычын, на якія Аллаг загадаў звяртаць увагу, з'яўляецца больш небяспечным, чым любыя таемныя змовы.

100. Карысныя супярэчнасці

Некаторыя прапаведнікі разносяць небыліцы пра тое, што нейкія варожыя сілы адзіным фронтам заўжды вядуць мэтанакіраваную барацьбу супраць ісламу. Хоць нядобразычыліўцы ісламу і праўда часам аб'ядноўваюцца для таго, каб выступаць супраць ісламу, але іншы раз і трапляюць у рознагалоссі. Больш за тое, некаторыя з іх часам нават прыносяць ісламу і мусульман карысць, незалежна ад матываў, якія падахвочваюць іх да гэтага.

Мусульманскі менталітэт павінен вывучаць нават нядобразычліва настроеныя сілы і дакладна разумець пытанні іх нязгоды. Мусульманін павінен паставіць гэтыя супярэчнасці на карысць для сваёй краіны і грамадства.

Паглыбленне ва ўяўныя абагульненні супярэчыць заканамернасцям, якія Аллаг уклаў у быццё, а таксама ўрокам старажытнай і сучаснай гісторыі. Такі падыход паказвае на інтэлектуальную ляноту. Прыхільнік такога падыходу проста спрабуе пазбегчы выкарыстання ўласнага розуму і не жадае шукаць шляхі вырашэння праблем. Роўна ў такой жа ступені гэта і псіхалагічная пастка, з-за якой ён спрабуе апраўдаць ўласную бяздзейнасць і баязлівасць.

ЗАВЯРШЭННЕ

У XX стагоддзі камунізм пацярпеў крах. Сёння заходні капіталізм таксама здае складаны іспыт – яго калісьці непахісныя каноны пад сумневам, а базавыя прынцыпы – пад вялікім знакам пытання. Сёння заходні абывацель можа заўважыць, што чыннікі былога панавання сілы і славы капіталізму сталі марнець, а чыннікі яго заняпаду мацнеюць з кожным днём. Законы ж, укладзеныя Аллагам ў гэта быццё, ніколі не мяняюцца і не падвяргаюцца сумневу.

Ніхто з людзей не здольны выратаваць чалавецтва, акрамя вас, прапаведнікі ісламу! Дык адпавядайце ж узроўню сваёй рэлігіі, узроўню сваёй сучаснасці, каб стаць капітанамі гэтага карабля, чым зробіце дабро і самім сабе, і ўсім людзям – як мусульманам, так і немусульманам.

Адказнасць, ускладзеная на вас, ахоплівае ўсе часы, усе краіны і ўсіх людзей. Ваш заклік – гэта заклік міласэрнасці, законы палягчэння, выдаленне складанасцяў і кайданоў, мяккасць да ўсіх людзей на зямлі. Менавіта таму вы павінны глыбока ўсвядоміць усю адказнасць.

Ведайце, што вы – прапаведнікі, а не суддзі; тыя, хто павінен выпраўляць людзей, а не выракацца іх; будаўнікі, а не разбуральнікі; літасцівыя, а не ненавіснікі. Вы мусіце ставіцца да людзей таксама, як бацька да сваіх дзяцей, або як лекар – да сваіх пацыентаў, а не так, як наглядчык ставіцца да зняволеных або як пакрыўджаны ставіцца да сваіх крыўдзіцеляў...

І калі вы станеце дзейнічаць такім чынам, то пойдзеце шляхам ісціны і наставіце на яго іншых – вы зможаце стаць самымі карыснымі для рабоў Аллага. А са-

мым любімым чалавекам для Аллага з'яўляецца самы карысны для людзей. І толькі тады людзі дазволяць вам весці іх шляхам дабра, святла і міру!

У гэтай кнізе быў згаданы шэраг правілаў. Уся яна, ад пачатку і да канца – вынік вялікага жыццёвага досведу, бесперапыннага чытання і аналітычнага вывучэння. Нам бы вельмі хацелася, каб гэтая кніга патрапіла ў рукі мусульман, а асабліва мудрых вернікаў, каб яна стала кіраўніцтвам для вядзення закліку, а таксама тэарэтычным і практычным кіраўніцтвам для іх. Мы б хацелі павялічыць долю ўзаемнай згоды, правільнасці і плённасці і зменшыць долю рознагалоссяў, памылак і бяздзейнасці.

Мы вельмі спадзяемся, што прапаведнікі дэталёва вывучаць гэтую кнігу, а затым выкажуць уласнае меркаванне, прапануюць штосьці скараціць або дадаць, а таксама выправіць або перагледзець шэраг пытанняў.

Мы абяцаем нашым шаноўным братам, што водгук кожнага аб гэтай кнізе будзе ўважліва і з удзячнасцю прачытаны. Хочацца, каб гэтая кніга ўспрымалася як нейкі канспект, які зыходзіць ад саміх чытачоў і прызначаны менавіта для іх. Таму чакаем ад іх водгукаў і прапановаў.

Унясенне прапаноў і іх публічнае абмеркаванне з'яўляецца самым лепшым спосабам адрозніць памылку ад правільнасці. Пачынаючы з гэтага этапу з'яўляецца крайняя неабходнасць раіцца з дасведчанымі прапаведнікамі, каб прыдбаць карысць ад іх меркаванняў. Менавіта таму гэтая кніга будзе вельмі актуальнай для ісламскіх арганізацый і таварыстваў. Яна – наш падарунак для іх. Кожная арганізацыя зможа знайсці ў гэтай кнізе карыснае, што адпавядае яе асаблівасцям, а таксама нешта дадаць у яе і развіць яе ідэі. Гэта прынясе багата дабра, з дазволу Аллага.

Уся дапамога і падтрымка – ад Аллага. Мы просім Усявышняга надзяліць нас поспехам, каб дасягнуць Яго задаволенасці, а таксама дабіцца паслушэнства Яму. Сапраўды, Ён Усемагутны над усім існым!

***

КУЛЬМІНАЦЫЯ больш чым паўвекавой працы і вопыту, гэты неацэнны буклет выкладае набор асноўных прынцыпаў, узятых з Кур'ана і Сунны, якія павінны быць узорам для кожнага мусульманіна, і асабліва прапаведніка, як на асабістым, так і на інстытуцыйным узроўні.

Запрашэнне да Божага паслання – гэта абавязак усіх мусульман, даверaны ім, і асноўны аспект нашага зямнога жыцця. Таму ганаровы абавязак выконваць працу найлепшым чынам, кіруючыся Кур'анам і метадамі Сунны, раўназначна пакланенню. Для гэтага нам неабходна ўвасобіць каштоўнасці, мараль і этыку, выкладзеныя ў гэтай кнізе. Мы мусім даць урачыстае абяцанне садзейнічаць развіццю, захаванню і заахвочванню супрацоўніцтва, талерантнасці, павагі і разумення сярод усіх людзей.

Доктар Хішам Ях'я ат-Таліб мае ступень доктара філасофіі. у галіне электратэхнікі (1974). Падчас працы інжынерам-электрыкам доктар ат-Таліб неўзабаве разгарнуў актыўную ісламскую дзейнасць у Паўночнай Амерыцы, якая працягваецца і дагэтуль. Ён займаў некалькі пасад у розных ісламскіх арганізацыях, а таксама праводзіў мноства навучальных лагераў і семінараў у ЗША і за мяжой. Ён з'яўляецца аўтарам "Вучэбнага дапаможніка для ісламскіх дзеячаў" і сааўтарам кнігі "Адносіны бацькоў і анні дзяцей".